Новы Час | 28 лютага 2020 | № 8 (667) | «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» | №2

Літаратурная Беларусь

Выпуск №2 (162)
(люты)

КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКІ ПРАЕКТ
Грамадскага аб’яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага Часу»
lit-bel.org
novychas.by

Змест

Маяк неўміручасці

Марыя БАРАВІК

Які намёк, якая песня?

Падсвілле. Сёмага лістапада. Кірмаш. І я бягу міма афішы на паварот да прылаўка.

Дык што там на афішы? Вяртаюся.

«Хочу назад в СССР!» — чытаю.


І ўжо міма мяне бягуць людзі. А я ўся — ураженне, адчуваю экспрэсію і чую асабістую рэакцыю: «Вялікакастрычніцкі настальгічны канцэрт запускаюць! Перад падпісаннем паглыбленай інтэграцыі. Здаюць незалежную Беларусь! Рвуцца назад у СССР! Мала ім Курапатаў, Афгана, Чачні! Канцэртамі агітуюць... А беларускі фальклорны гурт — «Балцкі субстрат» да парога школы не падпусцілі!» І нібы зноў чую ўслед: «Мы — государевы люди!». Дык хто сказаў? Дырэктарка ДК! Раённы дэпутат! Дзе ж тады народныя слугі?

Мова карануе незалежнасць

Аж другога снежня прыціхла мая ўнутраная завіруха. Настрой змяніла газета «Наша слова» (№ 48 за 27 лістапада). Яна з’явіла мне ўсмешку. Я ўгледзелася ў групу беларусаў (у іх постаці, твары, рукі на здымку) і ўжо мяркую: хто гэта? Ці тыя, хто слухае, што кажа віцэ-прэм’ер Беларусі пра Каліноўскага і паўстанцаў на пахавальнай урачыстасці, ці сам Ігар Петрышэнка ды іншыя афіцыйныя прадстаўнікі ад Беларускай дзяржавы? І здагадваюся: так і ёсць — ён і яны. Прыехалі, выйшлі з машыны — не трапілі яшчэ ў атачэнне беларускіх сцягоў. І тут жа скеміла па тварах: сцягі наперадзе іх — адлюстроўваюцца ў нечаканасці... Дык я пачынаю адгадваць думкі віцэ-прэм’ера праз свае, якія аж закучаравіліся ў фантазійных уяўленнях:

— Куды патрапілі! Ой-ёй!
Краіны сёняшняй сваёй
Забыліся мы ўзяць сцягі.
«Шкада!» — сказаў адзін-другі...

З вытрымкі прамовы віцэ-прэм’ера (у газеце) перачытваю яго думку пра тое, што дзейнасць Каліноўскага накіравана была на стварэнне беларускай дзяржаўнасці ў форме народаўладдзя, і во знаходжу яе ў сугучнасці з маёй. Дадаю: значыць, з карэннай мовай начале. Бо Кастусь выдаваў газету на роднай мове. Пісаў на ёй. Гэта ж яна, мова, карануе незалежнасць.



Выцінанка Вольгі Бабурынай

Аб’яўляла сэрца на аргане

Хоць і мінула 155 гадоў (у вечнасці — імгненне), народную думку ў Вільні ахапіла свята. Першае пахаванне паўстанцаў не мела над сабой жалобы. Дык жа Бог кіруе па-Божаму плану, згодна гісторыі руху жыцця. Лістападаўская падзея 2019 года, як сказаў Дзяніс Івашын: «Успалымненне нацыі». Думаю, што гэта — яднанне душаў свабоды ў сувязным ланцугу пакаленняў.

Дачуня мая, Марыйка, унесла мне ў душу паэтычнае хваляванне па мабільным злучніку: «Непарадавальнае бягучым словам ураженне... На аргане іграла побач з іконай Маці Божай Вастрабрамскай. Насупраць — акно, у якім — «вуліца», падобная на пахаванне Быкава. Тут, мабыць, больш сцягоў...».

У мяне пранікла яе духабачанне, і я схапілася за пяро.

Тваё сэрца білася ў аргане
Ў атачэнні сэрцаў і сцягоў.
Праўдзілася там з зямлі паўстанне
Кастуся й паплечнікаў яго.
Адыход парэшткаў да адхлання
Дух свабоды ў Неба замаліў.
Над катэдрай Бог пазначыў ранне
І святло над Вільняй запаліў.
Сэрцаў цёк ручай да Вострай брамы —
Пачуццяў народнага прыліў.
І да Неба выструніла прама
«Плошча» дух з трагічнае зямлі.
Там душа Айчыны ў палымненні,
На свабодзе слова і сцягоў,
Замаўляла ў Бога вызваленне
Ад пацём’я грэшнага ўсяго.
Аб’яўляла сэрца на аргане
Дух айчынны, боль усіх вякоў.
Час маліўся, аб’яўляў паўстанні
З чорных ямаў, з вапнавых пяскоў.

Вёскі былі жывыя, а ў вёсках — школы і клубы. Унутры жыў боскі дух, карэнная мова. Бо вёскі былі напоўнены вясковым народам. Яны трымалі мову, калі Масква сцірала ў сваю карысць моўныя нацыянальныя грані ўнутры рэспублік

У гэтай светлай, жыццесцвярджальнай малітоўнай жалобе часу ўдзельнічаў і хор Чырвонага касцёла — «Голас душы».

Ад чацвера да чацвера

Пятага снежня. Зноў чацвер. І я імкліва кіруюся да кірмашовага прылаўка.

Акурат, цюцелька ў цюцельку, на тым месцы, на дошцы-аб’яўніцы, паведамленне: «Мы ещё споём!». А я толькі што прачытала палітстаронку газеты «Новы час» — «Расійскі ўплыў і кантроль у Беларусі: рэзідэнтура».

Калі б — «спяём», дык і маё сэрца кінулася б у спеў, што незалежную Беларусь падтрымлівае роднай мовай Глыбоцкі культаддзел, адзначаючы саракапяцігоддзе Падсвільскага ДК, хай сабе, з дня функцыявання (з 1974 года) новага будынка і яго зместу. Але ж — не. У мінулы чацвер аб’яўлялася: «Хочу назад в СССР». А ў сёняшні: «Мы ещё споём!». Дык што? Гэта значыць — намёк? На якую песню? Па ўсім зразумела:

Ад чацвера да чацвера
Жыць вяртаннем эсэсэра —
Гэткі сёння наш дэвіз,
Вертыкальны зверху ўніз!

Не прыснілі б...

Думка спынілася во на чым: чаму разглядаецца толькі саракапяцігоддзе гісторыі ДК — ад года 1974? Ён жа ўзнік значна раней. Нічога, што той быў перабудаваны з польскай канюшні. Мы ж павінны разглядаць змест дзейнасці ў ім, асабліва патрыятычна-мастацкі, народны. Дык тады ніхто з гледачоў не змог бы і ўявіць, што на парог ДК ці на сцэну школы не пусцяць беларускі фальклорны гурт, такі, як «Балцкі субстрат» — плён прафесійнага кампазітара з дзвюма вышэйшымі музычнымі адукацыямі. Ды і сам кампазітар працуе ў дзяржаўнай музычнай установе. Гурт аб’ездзіў гарады, сёлы з канцэртнай праграмай. Толькі ў Падсвіллі Глыбоцкага раёна не ўдалося выступіць. Во дзівіліся б гледачы былога Дома культуры, каб, нават, прыснілі такую з’яву. Не паверылі б, што будзе існаваць клімат такой перастрахоўкі, што наўгад, на ўсякі выпадак, сцяной стане забарона. Абы забараніць. І дырэктарка ДК скажа: «Мы — государевы люди!».

Згадваю другую палову 60-х гадоў. ДК славіўся ў вобласці, у рэспубліцы самадзейным драматычным тэатрам (кіраўнік — Зоя Зарыцкая). Яна ж яшчэ жывая, вярнулася з Расіі ў Падсвілле. Працуе на агародзе, чытае кнігі і прысутнічае ў інтэрнэце. Але, атрымліваецца, што на гістарычнае мерапрыемства ДК яе не запросяць, бо яна вядомая як тэатрал таго перыяду, які не ўваходзіць у асвятляльны кавалак часу (1974–2019) гісторыі ДК. Яна славіла яго дзейнасцю раней, у будынку, ператвораным з польскай канюшні, якраз у час СССР, па якім так сумуе сёняшняя падсвільская афіша. Дзіўна. Парадаксальна. Чаму не разглядаецца поўная гісторыя ДК? Можа, не верыцца ў мастацкую працу ў былых умовах? У драўляных сценах, не на аб’ёмнай сцэне? Але сп. Зарыцкая стварала тут сцэнічную культуру па каштоўнасці — пасля Буйніцкага. Вірыла беларуская мова, разгортвалася маштабная карціна беларускага народнага жыцця, беларускіх характараў праз герояў: у «Паўлінцы», «Раскіданым гняздзе» Купалы; у «Партызанах» Крапівы; у «Ганцы» Галубка; у «Чатырох крыжах на сонцы» Дзялендзіка і ў многіх іншых драматычных творах беларускіх пісьменнікаў. Таксама і ў перакладзеных на родную мову, і ў асабіста напісаных для працы.

Тады вёскі былі жывыя, а ў вёсках — школы і клубы. Унутры жыў боскі дух, карэнная мова. Бо вёскі былі напоўнены вясковым народам. Яны трымалі мову, калі Масква сцірала ў сваю карысць моўныя нацыянальныя грані ўнутры рэспублік, аб’яўляла рускую — мовай камунізму. Кінафільмы на нашай мове не ствараліся. У бібліятэках на паліцах — кніг на двух-трох стэлажах. У асноўным — згодна з навучальнай праграмай. А літаратуры на рускай мове — разгуляйся!

Сёлета я ўжо не хадзіла — прасіць за мову. Сяму-таму паведаміла, накшталт:

Хутка перапісчык прыйдзе ў двор —
Запісаць таго, хто не памёр,
Дык скажы, што ты — ёсць беларуска!
І што мова родная твая —
Гэта неўміручасці маяк!

...Перапісчыкі сказалі, што ў Падсвіллі 90 працэнтаў насельніцтва назвалі роднай мовай беларускую.

«ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» | № 2 (162) | 28 лютага 2020 | № 8 (667) Новы Час

Пілігрым Беларушчыны



Васіль ЖУКОВІЧ

Яраслаў Пархута, чыё 90-годдзе адзначаем сёлета, 8 сакавіка, — з ліку маіх любімых пісьменнікаў. Ды не таму, што ён быў уганараваны Дзяржаўнай прэміяй, а таму, што быў вельмі чуйны да людскіх боляў, да народных бедаў і ўмеў мабілізаваць Богам дадзены талент — нягледзячы на самыя складаныя абставіны.

Накаванавай справе служыў самаахвярна. Мала хто ведае, што ён перажыў клінічную смерць, калі яму споўнілася крыху больш за шэсцьдзесят. Пра тое выпрабаванне гаворыць нам ягоны цяжкі сон, апісаны класічна. «Мяне вялі на расстрэл. Хто вёў — не ведаю. Усе яны былі ў масках», — такі пачатак сну. Яго на хаду абвінавачвалі тыя трое, што былі ў масках: «Ты аднойчы здрадзіў каханай! Ты аднойчы пакрыўдзіў дзіця! Ты аднойчы не падаў жабраку!» Ён, спадзеючыся на літасць, апраўдваўся: «Каханая ж пакінула мяне! Дзецям уласціва памыляцца. А кавалка хлеба і сам, бывала, не меў». Яму сказалі: «Усё адно грэх твой вялікі». І загадалі: «Спыніся і павярніся!» Ён спыніўся і павярнуўся. «Ударыла ў сэрца, і яно зайшлося ад болю». Ён закрычаў. Але голасу не пачуў свайго. Затое пачуў іншы — знаёмы і блізкі: «З вяртаннем, дружа!» Ён расплюшчыў вочы. Ля ложка ў белым халаце стаяў ягоны доктар. У правай руцэ трымаў шпрыц, а леваю марлевым тампонам з ілба здымаў халодны пот.

Ярослава да гэтага крызісу часта білі маланкі інсультаў ды інфарктаў (іх было ажно паўтузіна), а ён, падымаючыся пасля чарговага ўдару, яшчэ з большым азартам браўся за справу ці, больш дакладна, працягваў яе: ішоў да новых сваіх твораў-гімнаў Беларусі, твораў-дакументаў роднай гісторыі, твораў-услаўленняў мужных герояў, твораў-споведзяў растрывожанага сэрца і нялёгкага роздуму, твораў-абвінавачванняў зла...

Намаляваны пісьменнікам працавіты, майстравіты і таленавіты гусляр дзед Максім (у творы «Апошні гусляр») чымсьці нагадвае і яго самога. Яраславу Пархуту, чалавеку з роду плугароў, баліць душа не толькі за зняважаную зямлю, а за ўсё, што зводзіцца: за стан роднай мовы, за нашую духоўнасць, за народныя святыні, паламаныя лёсы і забраныя жыцці сыноў і дачок шматпакутнае Бацькаўшчыны. Сярод шматлікіх герояў Пархуты — яго славуты зямляк, кіраўнік паўстання 1794 года Тадэвуш Касцюшка, павешаны Мураўёвым у Вільні народны герой Кастусь Каліноўскі, знішчаныя злачынным сталінскім рэжымам легендарны пісьменнік, актор, рэжысёр, мастак Уладзіслаў Галубок і знакаміты вучоны-мовазнаўца, публіцыст, акадэмік НАН Беларусі Браніслаў Тарашкевіч, пакутнік XX стагоддзя Сяргей Новік-Пяюн, які спазнаў шмат гадоў няволі як пры паляках, так і пры немцах і маскалях, «палескі рабінзон» Іван Бушыла, які, ратуючыся ад сталінскага генацыду, сорак два гады (!) пражыў у глухім лесе. Між тым проза Яраслава Пархуты паэтычная, у ёй многа сонца, азону, прастору. І фантазіі, і філасофіі.

Аднойчы сваю пісьменніцкую ўвагу Яраслаў Пархута засяродзіў на школьным літаратурна-краязнаўчым музеі. Але на якім? На ўнікальным! На Гудзевіцкім літаратурна-краязнаўчым музеі (Мастоўскі раён), створаным вялікім энтузіястам, настаўнікам беларускай мовы, заслужаным дзеячам культуры Беларусі Алесем Мікалаевічам Белакозам і яго вучнямі. Унікальнасць гэтага астраўка краязнаўства, яго высокая культура паказаны пісьменнікам бездакорна. ... Гаспадар музея вядзе экскурсію, паказвае стэнды, цікавыя матэрыялы, распавядае пра іх. Адзін з першых стэндаў прысвечаны Францішку Скарыну. Нечаканы экспанат сюды прыйшоў з замежжа: праслаўлены наш спявак Міхась Забэйда-Суміцкі (родам з Пружаншчыны), які пражываў у Празе, прыслаў буклет-альбомчык з партрэтамі чэшскіх першадрукароў, асветнікаў, пісьменнікаў. Узрадаваў такі факт: чэхі першым змясцілі партрэт Скарыны. Наступная экспазіцыя — пра паўстанне К. Каліноўскага. «У нашай мясцовасці дзейнічала каля трох тысяч паўстанцаў, — кажа А. Белакоз. — Мы ганарымся і тым, што бацька Кастуся Каліноўскага паходзіў адсюль — з вёскі Рэпля». Алесь Мікалаевіч паказвае рэпрадукцыі карцін мастака П. Сергіевіча, прысвечаных гераічнай дзейнасці Каліноўскага. «А тут, бачыце, ручка, якою Уладзімір Караткевіч стварaў раман пра паўстанне Кастуся Каліноўскага «Каласы пад сярпом тваім», — гаворыць ён і знаёміць з наступнымі стэндамі, з матэрыяламі пра Дуніна-Марцінкевіча, Францішка Багушэвіча, Максіма Багдановіча. Тут і лісты-ўспаміны Зоські Верас — пра М. Багдановіча. Наведвальнікі музея часта здзіўляюцца: няўжо яна сама пісала нам успаміны? Няўжо гэта арыгіналы? «Так, пісала. Іх шмат, успамінаў Зоські Верас, — заўважае А. Белакоз. — Яна шмат зрабіла для Гудзевічаў».

> **Успаміны ў мяне пра яго выключна добрыя, светлыя. Яраслаў Пархута не толькі стаўся выдатным творцам і краязнаўцам, ён быў неардынарным чалавекам, непаседлівым, рухавым, мэтанакіраваным і вельмі ўмелым**



Злева направа: Я. Пархута, У. Пузыня і С. Новік-Пяюн

Фота www.vytoki.net

Адну са сваіх кніжак «Крыніца ёсць у родным краі» Яраслаў падараваў мне з такім аўтографам: «Суседу па фаэндзе, земляку і аднадумцу на добры ўспамін аб пілігрыму». Як бы я ні ставіўся скептычна да слова «аднадумец», перачытваць такое прызнанне вядомага пісьменніка прыемна. Успаміны ў мяне пра яго выключна добрыя, светлыя. Яраслаў Пархута не толькі стаўся выдатным творцам і краязнаўцам, ён быў неардынарным чалавекам, непаседлівым, рухавым, мэтанакіраваным і вельмі ўмелым. І меў радасць часта з ім сустракацца на лецішчы, дзе сусед бачыцца непараўнальна лепш, чым у гарадскім гмаху. Бачыў я, напрыклад, як займаўся ён пляценнем кошыка. Няспешна і акуратна згінаў два абручы, дапасоўваў да іх вочкі, устаўляў рабрынкі, і тады з ракітавых дубчыкаў на рабрыстай аснове «ткалася» роўненькае густое палатно, у выніку атрымліваўся на заглядзенне прыгожы кош. А як інакш, калі Яраслаў змалку любіў лес, добра ведаў грыбныя мясціны (ягадныя — гэтаксама), сам займаўся ціхім паляваннем і прышчапіў гэтую любоў дзецям: сыну Віктару і дочкам — Кацярыне і Волечцы, а пазней — і зяцю Аляксандру ды ўнуку Юрку. З поўным кошыкам праўдзівых (так у нас почасту называюць баравікі) бачыў яго летам даволі часта. Любіў ён грыбныя паходы. Мабыць, таму і адпаведная тэма ў Яраслава Пархуты нярэдкая: «Праўдзівікі», «Грузды», «Апенькі», «Позняя грыбы», «Размова з грыбамі»... Здавалася б, хіба можна размаўляць з грыбамі? Яшчэ як можна! І нават вельмі ласкава. Адну такую размову пісьменнік падслухаў на выхадзе з лесу, дзе бабулька перабірала баравічкі, і яскравым уражаннем ад пачутага хараша падзяліўся з чытачамі...

Любоў да лесу ўдалага грыбніка не замінала яму быць і харошым садоўнікам. Дзякуючы толькі яму я, няхай сабе ўжо ў сталым узросце, навучыўся прышчапляць дзічкі яблыняў і грушаў. Аднойчы ён прынёс мне паўжмені яблыневых чаранкоў розных летніх гатункаў і паказаў на маю дзічку, што расла каля самай вуліцы: «Прышчапляй, пасля — як знойдзеш...». Прыжыліся ўсе тры летнія гатункі, яблыня разраслася і кожнае лета так родзіць, што яблыкамі частуем і суседзяў, і прахожых. Цяпер светла ўспамінаю Яраслава Сільвестравіча не толькі беручы ў рукі і чытаючы ягоныя кнігі — успамінаю ўсё часцей, калі сад цвіце і калі адцвітае, засяваючы зямлю пялёсткамі, а пазней адорвае пладамі, і калі з дрэваў ападае лісце, і калі самотны сад патанае ў снезе... Як не ўспамінаць, калі Пархутава хата, крайняя ад дарогі, стаіць побач з маёй. З той хаты ён ішоў да людзей — у шырокі свет.

А пазнаёміўся я з ім у 1965 годзе, калі ён працаваў старшым рэдактарам Брэсцкай студыі тэлебачання. У тым ужо далёкім годзе была ў нас адна сумесная паездка, якая і тады выклікала і цяпер выклікае ў мяне ўсмешку. Напярэдадні нарады перадавікоў сельскай гаспадаркі абласное начальства вырашыла мабілізаваць вопытных літаратараў і журналістаў на стварэнне вершаванага тэксту для піянерскага прывітання вартых пашаны працаўнікоў сяла. Для такой адказнай місіі і паклікалі ў аблвыканкам Яраслава Пархуту, Міхася Рудкоўскага, Анатоля Гарая і мяне. Старэйшы з нас, самы бывалы, Яраслаў сказаў загадчыку аддзела: «Ведаеце, у горадзе зашмат шуму, грукату, ад чаго ўцякае муза. Мы мусім акунуцца ў цішыню. Дайце нам камандзіровачку ў Белавежскую пушчу».

Калі мы апынуліся ў Камянюках, у гасцініцы вядомага запаведніка, адразу прыступілі да справы. За кароткі час зрабілі чарнавы варыянт даручанага нам задання і пайшлі на ўскраек пушчы па грыбы. Назбіралі грыбоў, занеслі іх на кухню рэстарана, дамовіліся, каб кухаркі пасмажылі. Падчас вячэры мы пачуваліся шляхтаю. Пад жаданую закусь заказалі па сто грамаў армянскага каньяку (нам жа ў Берасці выдалі камандзіровачныя!). Добра прыгатаваныя і пададзеныя нам грыбы стаялі ў спецыяльнай пасудзіне ў выглядзе стажка і пахлі свежа ды так прыемна, што на нас пазіралі ўсе з-за суседніх сталоў...

Яраслаў праўдзіва называў сябе пілігрымам. Не ведаю, ці ад прыроды, ці ад адукацыі стаўся такім. Па прафесіі быў ён журналіст з ярка выражаным краязнаўчым ухілам. Натуральна, падарожжы па Беларусі, выкліканыя няўрымслівасцю натуры, надзвычайнай дапытлівасцю, руплівасцю і бязмежнаю любоўю да Беларусі, да яе мудрых, мужных, працавітых людзей, прыносілі яму радасць і плён. У выніку з'явілася мноства твораў пра мясціны, дзе нарадзіліся ці жылі слынныя людзі зямлі нашай, пра самых людзей: і мудрых, і мужных, і цягавітых.

Але не толькі пра іх. Яраслава Пархуту цікавілі і вабілі і вядомыя радовішчы, тыя вытворчасці, якія давалі краіне важкі рубель (здабыча беларускай нафты, калійнай солі, граніту, радону...), і ўсё незвычайнае, часам палярнае, скажам, самая высокая і самая нізкая геаграфічныя кропкі рэспублікі, самая паўночная і самая паўднёвая, самая ўсходняя і самая заходняя вёскі, самы ўнікальны дуб, буйнейшая ў Еўропе калонія чорных чапляў, месца падзення Брагінскага метэарыта; яго непакоілі праблемы экалогіі, выкарыстання зямлі, побыту сялян, стан нашых лясоў, малых рэк, помнікаў прыроды. Вабіла старажытная гісторыя, род крывічоў. І таму пастаянна клікалі дарогі.

Яго і хвіліна скону застала не дома і не на шпітальным ложку, а пад адкрытым небам. У сакавіку, у тым жа вясновым месяцы, калі з'явіўся на белы свет. Яшчэ за два дні да смерці Яраслаў ездзіў на вечарыну ў Дом літаратара, слухаў добрую музыку, дзіцячыя спевы, быў поруч з сябрамі па літаратурным цэху... У адным з ягоных твораў Празарока, які нёс варту на ўзвышшы, з грудзей сваіх вырваў палымянае сэрца і падняў высока-высока, каб папярэдзіць краю пра галоўную небяспеку — набліжэнне ворага. Яраслаў Сільвестравіч не шкадаваў сваё сэрца, параненае інфарктамі, аддаваў яго цеплыню і святло людзям. Шчыры і шчодры сын селяніна ад імя абкрадзенага і зняважанага працоўнага люду выказаў сваё крэда ў «Тастаменце»:

«Адпісаў бы табе зямлі. Але ў мяне, селяніна, адабралі яе і, знявечыўшы, засеялі чарнабыльнікам.

Адпісаў бы табе грошы. Але я існаваў з працы рук сваіх — не сабраў за жыццё і капейчыны.

Адпісаў бы табе храм. Але яго няма, а на руінах святыняў яшчэ правіць шабаш антыхрыст.

І таму адзінае, што адпісваю табе, — гэта Любоў да краю роднага. Зберажы яе і перадай дзецям сваім. А дзеці няхай перададуць сваім дзецям. А тыя — сваім...

Тады мо ўсё і вернецца на кругі свая».

Сваёй дарогай



Анатоль ВЯРЦІНСКІ

Буркочуць на балконе галубы...

По матывах верша Генадзя Бураўкіна «Калі ты жыў нямала на зямлі»

Буркочуць на балконе галубы...
Няма найлепшай птушкі хатняй.
Я ўжо прывык да іх «гу-у-у-у», нібы
балкон мой стаў ім галубятняй.

На лецішчы пра сон, — сон у руку, —
пачулася спагадлівае, ветлае,
як ранішнія промні, светлае,
чароўнае зязюліна «ку-ку».

І тут жа бачыцца мне — у акне:
на провад ластаўка ўвішна села,
зашчабятала ласкава, запела...
Ці не вітала гэтак вось мяне?

Калі ж з мансарды я спусціўся ўніз,
мяне чакаў яшчэ адзін сюрпрыз,
стаў сведкаю яшчэ адной падзеі:
шпак са шпачыхай прыляцелі!

Вярнуліся ўсё ж назад,
адолеўшы цяжкое падарожжа, —
на тое ж месца, ў той жа сад
і да маёй шпакоўні той жа.

Зязюля, ластаўка, шпакі...
А ў агародзе блізка-блізка
галодная прабегла міма пліска,
ледзь не крануўшыся маёй рукі.

І як ніколі, ў гэты майскі дзень
адчуў я, што я нешта значу,
што прызначэнне нас, людзей —
не толькі клопат пра сваю ўдачу,
а што ў адказе мы яшчэ якраз
за ўсіх, каго мы прыручылі,
за ўсіх, хто сам прывык да нас,
за ўсё жывое — у сваёй Айчыне.

Найгоршы грэх — не апраўдаць
даверу іх, іх спадзявання...
Такім вось чынам, дарагі Генадзь,
я і ўспрыняў тваё пасланне.

Ці слушна прачытаў твой верш?
Ты можаш, дружа, не спяшаць з адказам.
Ты ў вершы жыў і ў ім жывеш,
ну а ў маім — жывем мы разам.

Пра дзіўнае адчуванне

Дзіўнае, знаеце, адчуванне,
адчуванне — пераажыванне...
Яно ў форме пытання ўзнікае:
«Дзе тая мяжа, тая рыса, якая —
між «ёсць» і «няма», між «быў»
і «не стала»?
Між «тут» і «там», між «шмат»
і «мала»?

Між светам гэтым і тым светам,
ці то змрочным, ці то светлым?
Між нашым сёння і нечым вечным,
ці то бязлюдным, ці то чалавечным?

Яны ў адным клубку знітаваныя —
рэальнае, яўнае і віртуальнае.
Так, дзіўнае гэткае вось адчуванне,
адчуванне — пераажыванне.

Размова на досвітку

Рыхтуючыся да ўдзелу ў паэтычным свяце «Бабіна лета ў Белаазёрску з Нінай Мацяш», якое ўжо стала традыцыйным, знайшоў раптам амаль паўзабыты прысвечаны ёй верш. Пад назовам «Размова на досвітку». З нейкай прычыны не апублікаваны. Вырашыў зрабіць гэта цяпер, з нязначнымі праўкамі. Заўважу: «досвітак», «світанне», «світальны» — адны з улюбёных слоў Ніны Мацяш.

Тры дні таму, за горадам, на дачы,
дакладней — на сваёй мансардзе дачнай,
у прадсвітальнай летняй цішыні
я абудзіўся з думкай пра цябе
(ці не прыснілася мне перад гэтым?).
Звярнуўся ў думках я з пытаннем:
«Ці ведаеш, ці уяўляеш ты,
як многа для мяне ты значыш?
Як важны для мяне твой лёс?»
Падумаў для мяне і спахапіўся,
і стаў вініцца ў той жа міг
за тое, што вось так эгаістычна
пачаў на досвітку з табой размову,
і крыху ўдакладніў сваё пытанне:
«Ці ведаеш, ці уяўляеш ты,
як многа значыш ты для нас,
для сваіх блізкіх па крыві і духу?
Для ўсёй сваёй шматлікае сябрыны?
Для ўсяе роднае краіны?
Ты — са сваёй усмешкай і слязой,
ты — са сваёю доляй і нядоляй,
ты — з сэрцам, сэрцайкам сваім,
такім вялікім і такім дрыготкім,
такім трывалым і такім пяшчотным,
ты — са сваімі праўдай і сумленнем,
ну і, вядома ж, са сваім «Агменем»...
Ці ведаеш, ці ўсведамляеш ты?
І ў перадранішнім святле
мне ўявіліся твая ўсмешка,
усмешка незвычайная твая,
і мудрая, і крышку іранічная,
твая усмешка, воблік твой.
І ў прадсвітальнай цішыні
пачуўся мне ў адказ твой голас:
«Чаму пра гэта я павінна ведаць?
Чаму павінна гэта я ўяўляць?
Чаму усведамляць павінна?
Мне што — няма чаго рабіць?
Займацца чым? Пра іншае што думаць?
Які мой лёс, якая само́ ёсць, —
такую і прымайце, ягамосць!
Вам лепей знаць, што значу я для вас,
а мне відней, што для мяне вы значыце,
вы — блізкія па духу і крыві,
мая сябрына і мая краіна.
Ямчэй прымошчваю я на плячах свой крыж
і вам усім кажу я: «Будзьма!»
ды рушайма далей сваёй дарогай!»

Замова на беларускую мову



Святлана КАРАНЕНКА

Чуеш, мама, я павінна была б быць
гучнай і сонечнай
беларускай паэтэсаю.
Словы адно да другога мелася падбіраць,
нібы анёлаў для раю нябеснага.
Мелася стаяць на трыбунах звонкай,
расхрыстанай,
трохі смешнай і... даўганогаю
у джынсах ці вышыванцы — усё роўна,
калі ідзецца пра беларускія словы,
што ірвуць маё сэрца растрывожанае.

Я мелася раскашаваць у мове маёй
беларускай,
як раскашуюць у мядовым соладзе,
мелася называць беларускімі словамі
травы і рэкі,
мелася назвы даваць кветкам і ветру,
мелася распавядаць пра выносныя сосны,
што застылі ў ранішнім холадзе
у краіне азёр і рэчак —
на зямлі беларускай,
як на Богам забытай палітры.

Мама, слова «Івацэвічы» дрыжыць
на тваіх губах,
нібы глыток мёду духмянага і гарачага.
Я не была ў Івацэвічах.
Не ведаю, ці буду.
Але назвала б словам тым
дзяцінства тваё шаўковае
і згадала б твайго дзядулю,
найдабрэйшага ў свеце,
з беларускаю калыханкай ля ложка
твайго дзіцячага.
І яшчэ б згадала прыбітую на дзвярах,
як герб пана Рэчы Паспалітай,
тонкую, нібы намаляваную,
срэбную падкову.

Мама, усё выбіраюць на свеце —
мову, краіну!
Ці ж пачую я слова твае,
беларускай агучанае?
Гэты акцэнт беларускі,
як соль ці як стыгмы,
праступае ўпарта скрозь родны твой
голас:
«Гэта — кастрычнік!» — гартаеш ты
новы каляндар з Беларусі
і штосьці такое, накшталт пяшчоты,
неўсвядомлена,
праступае ў горле тваім,
і спадаюць на плечы твае валасы,
як жоўты падрэзаны сноп.

Мама, у час наш, жорсткі і непрыветны,
што ўсё перамельвае вечнымі жорнамі,
праступае ўпарта вышыўка крыжыкам,
і ўсё роўна, адкуль яна —
з Івацэвічаў ці з нейкай гуцульскай гражды.
Мама, мелася я вышываць беларускія
словы,
словы маёй мацярызны,
белым па беламу ці чорным па чорнаму...
Колькі пяшчоты ў горле тваім ахрыплым:
«Студзень, красавік...»
Ох, мама! Кроў перадаецца ў спадчыну,
пяшчота — не заўсёды.

Мама, я мелася быць беларускай
паэтэсаю,
Каб цешыцца мовай гэтай празрыстай,
нібы возера ў лесе,
з прысмакам мёду духмяна-крывавае
кветкі,
і падтрымаць яе, словы шаптаць,
як на першым прычасці,
словы з салодкага раю.
І каб дзеўчына беларуская войкнула,
прачытаўшы іх, вышываныя нібыта
золатам.
Так вераць замовам, якія помняць цяпер
толькі старыя беларускі
і нашэптваюць поначы, стаўшы ў круг,
на шчасце.

А памятаеш, мама, першыя словы,
якіх ты дзяцей маіх навучыла?
Навучыла маскоўскіх! Нешта, мама,
усё-такі нам зрабілі!
А крык мой памятаеш, мама?
Як пачарнеў мне свет ад роспачы
і бяссілля!
Як закрычала ўпершыню на цябе:
«Мае дзеці будуць гаварыць па-ўкраінску!»
...Мову, мама, усё ж выбіраюць —
і вольныя, і нявольныя, і прыгнечаныя,
нават тыя, што цішэй за вільготны
вецер,
густы туман
і зімовыя цёмныя,
паламаныя снегам сцяблінЫ.

Чуеш, мама, я мелася быць
беларускай паэтэсаю...

Пераклаў з украінскай мовы
Вячаслаў Рагойша

Замова ад асіміляцыі

Магчыма, я не заўважыў бы ў газеце «Літературна Україна» (18 студзеня 2020 г.), тым больш не перакладаў бы гэты новы верш вядомай украінскай паэтэсы Святланы Караненка, каб не адна акалічнасць...

Яе верш «Замова на беларускую мову» прыцягвае ўвагу вастрынёй думкі, кранае шчырасцю пачуцця. Любоў да роднай мовы, хваляванні за яе лёс у грамадстве вельмі дарэчы і таленавіта падаюцца тут праз зварот да фальклорнай формы замоў. Рытмічна арганізаваны тэкст перамяжоўваецца сказамі, якім надаецца сіла магічнага ўздзеяння. Сэнсава-сінтаксічныя паўторы гучаць як заклінанні на добрую будучыню роднай мовы. Гэта і просьбы, патрабаванні, пажаданні маладым матулям, каб не адракаліся ад роднага слова, вучылі сваіх дзяцей роднай мове.

Я веру, што гэты твор надзелены яшчэ і патаемнай сілай замовы ад асіміляцыі. Бо, на жаль, статыстыка сведчыць, што ў гэтым навучальным годзе ў беларускамоўных класах за парты села менш 10% першакласнікаў. Гэта нават менш, чым было калісьці ў БССР, і разоў у восем менш, чым налічвалася вучняў у беларускамоўных класах Рэспублікі Беларусь чвэрць стагоддзя назад...

Святлана Караненка ў сваім творы, звяртаючыся да аўтабіяграфічных момантаў, з настальгіяй прамаўляе: «Мама, я мелася быць беларускай паэтэсаю...». Чаму не стала? Пра гэта і верш, і невялікая прадмоўка да яго самой паэтэсы. Часам і ў нас у прыгожую пісьменнасць прыходзяць людзі, выгадаваныя ў асіміляваных рускамоўных сем'ях, і пачынаюць сваю творчасць на рускай мове. Праўда, здараецца, падарослеўшы, нацыянальна ўсвядоміўшы сябе, вяртаюцца да мовы беларускай. Як, напрыклад, прыйшлі ў родную літаратуру Віктар Казько, Леанід Дайнека, Іван Ласкоў ды інш. Так прыйшла ва ўкраінскую літаратуру і Святлана Караненка.

Але дамо ёй слова:

«У маіх бацькоў быў міжнацыянальны шлюб. Бацька — украінец, мама — беларуска. Як вы думаеце, якой была мова зносін? Так, вы не памыліліся, — маскоўская. Дакладней, маскоўская трасянка. Іхняе дзіця, зразумела, было аддадзена ў рускую школу. І, зразумела, павінна было гаварыць на рускай мове. Збольшага, усе, хто выходзіў з рускіх школ, да ўкраінскай мовы не звяртаўся. Але ўкраінскія гены часам выяўляюць свой характар...

Гэты верш прыйшоў раптоўна, пасля таго, як мне быў перададзены перад Новым годам для маёй мамы каляндар на 2020 год. З Беларусі. Я прывезла гэты каляндар і ўбачыла дзіва: мая 80-гадовая мама пяшчотна праводзіла рукой па яго старонках і прамаўляла па-беларуску назвы месяцаў...»

Да гэтага варта дадаць тое, што насценны беларускі каляндар на 2020 год, які выклікаў нараджэнне верша, — гэта наш з Таццянай Кабржыцкай падарунак Святлане Караненка і яе мужу, выдатнаму ўкраінскаму пісьменніку, сябру Уладзіміра Караткевіча Міхайлу Слабашпіцкаму. Святлана Караненка вылучана сёлета на атрыманне Нацыянальнай прэміі Украіны імя Тараса Шаўчэнкі. Пажадаем ёй далейшых поспехаў!

Вячаслаў Рагойша

Адшчапенец



Мікалай МАРОЗ

Стары і ёсць стары: усё яму не так. Бурчлівым стаў дзед Мацей.

Прачнуўся ён у сваёй хаце (хаця і называюць дзеці яе дачай), а ўставаць не хоча. Песціцца ў ложку, кліча жонку Праскоўю:

— Ці чуеш, Проська (так ласкава называе ён сваю палавіну), дзе ты там, га? Падала б акуляры, ці што…

— Чытаць яшчэ рана.

— А я і не чытаць якраз…

— А што?

— Трэба!

Гэта ў яго такі капрыз, каб выйшла па-ягонаму. Акуляры яму зусім і не патрэбны, а вось хоча, каб Прося яму паслугавала…

Прося памерла першай. Памерла нечакана, сярод ночы. Легла звечара ціха неяк, непрыкметна. Памалілася перад сном, надзела свежую начную кашулю. Ён скруціўся ў зале. Глядзеў тэлевізар, прыснуў, прахапіўся ад хрыпаты. Ускочыў, пакуль даўмеўся, што да чаго, ведама, спрасонку, так і сядзеў на краю ложка. А тады асяніла: Проська! Кінуўся ў спальню і акамянеў: жонка ляжала прыціхлая, быццам спала, адно што праз стуленыя губы цадзіліся з роту струменьчыкі ружовай пены. Ён прыпаў да яе грудзей і застагнаў…

Наляцелі дзеці, унукі, крычалі, плакалі, а ён сядзеў адлучана на табурэце побач з дамавінай, пакуль нехта не крануў яго за плячо:

— Ідзі, тата, адпачні!

Гэта старэйшая дачка, Танька. Ён паслухмяна пасунуўся ў спальню, прылёг на той ложак, які ўчора быў за божую пасцель яго Просьцы.

Недзе паўгода аўдавелы Мацей хадзіў сам не свой. Наязджалі дочкі з дзецьмі, суцяшалі. А неўзабаве раптам загаварыў з Танькай аб пераездзе на сваю радзіму, у вёску Задоры, што на Міншчыне. Не зусім, праўда, «раптам». Заводзіў не раз гаворку пра Задоры з Проськай, вядома, калі тая была ў гуморы. Ведаў, калі злая — лепш пра гэта і не заікацца, тады пачынае доўга пілаваць, усё дакараючы, што не трымаецца сваёй сям'і. Але ўсіх гэтых гаворак дзеці і не чулі: яны жылі ўжо сваімі сем'ямі. Таму Танька і акруглілa вочы:

— Ты што, з глузду з'ехаў? Ад нас, туды, дзе цябе даўно не чакаюць? Ад мамы, якая тут памерла?.. — сыпала яна пытаннямі. Ён маўчаў, пакорлівы і ціхі, як няўцешна хворае дзіця.

— Я тут кватарант, — прызнаўся шчыра. — А там буду жы-ы-ць!..

— Тата, старое дрэва не прыжываецца нават на радзіме. Дзе ты будзеш жыць? Хату ж бацькаву звезлі…

— Па першым часе прытуліць добрыя людзі, а там куплю. А можа і пастаўлю сваю, там, дзе наша стаяла. Месца ж там хопіць.

— Ну, фантазёр!..— вырвалася ў яе абурана. — Хто табе паставіць? За якія шышы?..

— Прадам сваю хату.

— Не, дачу ты не прадасі! Яна патрэбна нам, тваім дзецям, унукам…

Ён застагнаў. «Няўжо тупік? Няўжо давядзецца чакаць сваёй смерці тут, на чужыне? І чаму «не прадасі»? Аддалі ж з Проськай ім, дзецям, кватэру, зараблялі добра, дык памагалі і грашыма. Самі выехалі на дачу, абы не замінаць дзецям. А тут і хата ім патрэбна…Там, у Задорах, мне… там іншае паветра… там маладзеў бы душой, а тут зачэзну…»

У Задорах апошні раз Мацей быў на пахаванні свайго стрыечнага брата. Свайго аднакласніка. Пяцёра з іхняга класа пайшлі ўжо на вечны спачын. Адзін — ад гарэлкі, другі доўга і пакутліва хварэў, брат ягоны памёр на трэцім інфаркце. Дык вось тады падчас жалобы зразумеў Мацей: ён — адшчапенец, дэзерцір, эмігрант — як хочаце называйце, але ён здрадзіў святому, сваёй маленькай радзіме.

Праўда, на добры розум, дык што тут здрадлівага: як выехаў на вучобу пасля школы, дык у Задорах бываў наездамі. А пасля адправілі на Віцебшчыну. Там знайшоў сям'ю, асеў. Сёння каяцца позна, калі б гадоў дваццаць назад з гэтых гіблых мясцін перасесці зноў на пясочак, бліжэй да бору і рэчкі. А тут адно возера, і тое штучнае, купацца нельга…

Тры гады мінула, як пахаваў брата. Тады, на пахаванні, падышла да яго хударлявая старая. «Сынок, ці помніш ты маю Анечку? — спытала. — Вунь яна! Даўно гэта было, а яна помніць, як цалаваліся вы пад вярбою…» Ён тады прамаўчаў, хаця падмывала сказаць: што было, тое хмызам парасло!..

Сёння ўспомніў не старую — яе дачку Анечку. Тады ёй было шаснаццаць, яму дваццаць два. Яна — вучаніца, ён — студэнт, які прыехаў у вёску на канікулы. Цяпер яна распаўнелая і нязграбная. Навошта ж верадзіць старое? Ці з адной Аняй ён цалаваўся?..

«Не, пераезд — гэта не пацалунак пад вярбою, — спыніў сваю апантанасць Мацей. — Тут з галавой у вір не паляціш: не малады ж. Каб пасля не кусаць сябе за локці. Трэба абдумаць…»

А вясной, не мінула і года пасля жалобы, пра ад'езд загаварыў больш настойліва, і гарачліва пярэчыў, калі тая ж Танька зноў выкідвала свае козыры, адгаворвала, а калі ён усё ж не здаўся — заплакала ў бяссіллі.

Не пайшла супраць волі бацькі і малодшая, Наташка. Хату прадалі хутка (балазе, побач з горадам), падвярнуўся купец грашавіты і згаворлівы. Але ж куды, пад які дах? Ні кала там, у Задорах, ні двара. Прадалі на сядзібе Сідара Самцова хату гадоў дваццаць назад, а цяпер давядзецца ехаць у сельсавет, каб далі дазвол на будаўніцтва і зямлю. Усім гэтым займаўся старэйшы зяць Міхась. У яго і машына ў руках, і бойкі ён на язык. Тым больш, што напрасіўся сам. Так і сказаў: «Разумею Сідаравіча. Гэта ў нас з ім ад Бога — адданасць радзіме». Нясціпла, вядома, але не пра гэта думала Танька, выпраўляючы бацьку з мужам у няблізкую дарогу. Няблізкую — хіба для Мацея, а Міхасю гэтыя 250 кэмэ на іншамарцы — раз плюнуць.

Мужчыны вярнуліся назаўтра адвячоркам.

— Дзе вы былі? Дзе начавалі? Мы ўжо абарвалі ўсе тэлефоны, — уссядала на Міколу Тацццяна. — Дзе твой мабільнік?

Ён таямніча і крыху хітравата падміргнуў цесцю. Той удзячна ўсміхнуўся і ўваліўся стомлена ў фацэтнае крэсла.

Аднекуль выскачыла, прыпала да дзеда Насцечка.

— Ты што, дзеду, пакідаеш нас?

— Ну, што ты, малеча?!. Хіба без вас я выжыву?..

— Мы будзем да цябе прыязджаць, — адгадала яна дзедавы хітрыкі.

Таццяна ўзялася распытваць бацьку: як ды што, ды колькі, ды калі?.. Дазвол на будаўніцтва далі, хата там і цеснавата. Як раней ставілі хаткі — страха пры страсе. Сёння такое не дапускаюць — хапае ж зямлі. А прыйшлі да згоды пры ўмове, што сваю хату Мацей паставіць у глыбіні падворка і размах у яго будзе сціплы. «Нашто мне, старому, хароміна?! — даводзіў ён у раёне. —Хата пяць на сем і калідорчык. Як было ў таты…»

Яны паспелі дамовіцца і з хатай, якую перавязуць у наступныя выхадныя. Зымшаць і паставяць пад шыфер. А там дадуць грошай Міцьку Корышу (майстравы чалавек, хаця і п'янтос) — ён помніць дзядзьку Мацея, і той за месяц-другі здасць «маёнтак» пад ключ.

— Ох, як гладка ў цябе ўсё выходзіць! — упікнула мужа Таццяна. — Не паспелі з'ездзіць — і ўжо маёнтак пад ключ!..

— Павер, Танюша, міне не ў капусце знайшлі! Вось мы з Андрэем і паедзем. Возьмем яшчэ пару чалавек. А для парадку пакінем там Андрэя за аканома…

Андрэй — гэта меншы Мацееў зяць. Ён настаўнік, і якраз у яго летні водпуск. Той на рэпліку Міколы адно паблажліва ўсміхнуўся. Не запярэчыў, ды і не мог пярэчыць, бо паважаў цесцеў выбар.

— А што, і застануся на тыдзень-другі. Гэта нават арыгінальна!..

Кажуць: чалавек плануе, а Бог распараджаецца. Так яно і сталася… Тая кабета, у якой меліся купіць хату на вываз, доўга вагалася — прадавац ці не, вось тады і спатрэбілася мёртвая хватка Міхася. Ён абарваў яе тэлефон, а пасля трохі і прыстрашыў. Тая і змагласа. Таму паехалі разбіраць ды імшыць на трэція выхадныя. Парупіліся, прыхапілі яшчэ і панядзелак, пакінулі «аканома Андрэя», а самі рванулі назад, на Віцебшчыну. Заікнуўся і стары, каб застаца з малодшым зяцем, але Міхась запярэчыў: «Вам, Сідаравіч, у горадзе спраў да гібелі. Трэба ж рыхтавацца да пераезду…».

Цяпер Мацей адной нагой, лічы, быў у Задорах. І сны яму ўжо сніліся з задорскімі краявідамі.

Другая нага Мацея, вобразна кажучы, ступіла ў Задоры ў канцы лета. Пераезд назначылі на канец жніўня. Паехаць туды і глянуць, як асталюецца стары, захацелі і дочкі з зяцямі, і ўнукі. Нагрузілі скарбу на цэлы грузавік, самі ж уперадзе рулілі на легкавушках.

…Свята вяртання наладзілі на падворку. Суседзі прынеслі сталы, лавы, табурэты, і да вечара ўжо шмат хто не мог ні лыка вязаць, ні нагой ступіць. Чалавек пяць мужчын, як кажуць, патанулі ў нірване прама тут жа, на мурагу. Жанчыны заспявалі, і гэтак голасна і тужліва, што Мацей праслязіўся…

Першая ноч на новым месцы была бяссоннай. Мо таму, што пераматаміўся, багата перажыў за турботлівы дзень. Пад раніцу змогся і спаў гадзін да васьмі. Ніколі такога з ім не здаралася: *там* успорваўся а палове шостай. Пацягнуўся ў ложку, выйшаў на двор.

У суседзяў гарланілі пеўні, за высокім парканам ад вуліцы пралятaлі па асфальце машыны. Ён сёння ж пойдзе па тых мясцінах, дзе ступаў хлапчанём ці зялёным юнаком. Але спярша — могілкі, дзе пахаваны ўсе ягоныя сваякі. І дзед з прадзедам, і тата з мамай.

Ён пайшоў да Мікалайчыка, у яго ўнучка вырошчвае кветкі, яна і зрэзала жменю позніх гладыёлусаў. Пасядзеў на лавачцы ля помніка, бліжэй да мамінага фота на паліраваным мармуры, у думках пагаварыў і з ёю, і з татам.

Наступную раніцу Мацей пачаў з грыбоў. Да ягад у яго з дзяцінства душа не ляжала, хаця прыспела пара брусніц. І наказалі яму ўчора — ёсць на Сымонавых Лядах. За балотцам. Недалёка, напрамкі дык і не больш за кіламетр. Але рашыў пачаць з грыбоў, а ягады нікуды не ўцякуць.

Ішоў і — не пазнаваў наваколля. Да поля, праз якое праставаў да лесу, падступаў некалі хмызняк, тут было процьма маліны. Сёння разлога, калгасны палетак — ажно да самага лесу. Усё гола, няма за што і вока зачапіць. Дарога вяла на Падлессе, туды задорская моладзь хадзіла на танцы, бо свайго клуба не мела. Дарога дзічэе, сціскаецца хмызам і дробным бярэзнікам. «Не тое, не тое, не тое…» — забіла ў скронях нечаканая жылка.

Але Мацей не хоча верыць у такі вердыкт, прычына ў іншым. У чым жа?… «У чым, у чым, у чым…» — зноў запульсавала жылка, і было прыкра ад гэтага, пакуль не выхапіў погляд статнага мацака, які стаіўся, узняўшы шапкаю мох. «Баравічок!» — усцешыўся, падбег, памацаў за крамяную ножку. «Ах ты, гарэзнік! Захацеў схавацца? Не выйдзе, дружа!» — гаварыў Мацей задаволена. Пакуль зразаў, згледзеў, седзячы на кукішках, яшчэ аднаго, такога ж прыціхлага і зваблівага. А далей яшчэ адзін, яшчэ…

На дарогу выбіўся толькі пад вечар. Перабраў грыбы. Яшчэ раз парадаваўся: сорак пяць баравікоў, цэлы кошык з коптурам, і лісічкі на смажонку… І тут працяла пякучая думка пра жонку. Як гэта ён раней жыў, каб не з'ездзіць на магілку?.. Як? Хто ён пасля таго? Пражылі ж разам амаль сорак гадоў, а ён і не думаў пра яе… Трэці тыдзень тут і ні разу… Не, двойчы выскачыла думка пра нябожчыцу-жонку, вечарам, перад сном. І сніў яе аднойчы. Чаму ж не падумаў там, што тут, за 250 кіламетраў, будзе без яе няўтульна, маркотна, гнятліва? Бач, выправіўся, асеў, знайшоў шчасце? Ці шчасліва ён *тут*, калі *там*, няхай і на чужыне, засталася жончына магілка, *там* яго дзеці, любімая ўнучка Насцечка, *там* засталася памяць? Але ж і *тут* памяць — пра бацькоў, пра сваё гарапашнае дзяцінства…

Не, сёння памяць пра жонку — бы тая свежая рана, якая яшчэ не загаілася, таму і прыкра на душы ў Мацея. У лістападзе споўніцца год, як не стала Просьcі. Чаму ж ён раней чаму збег у Задоры, чаму не дачакаўся гадавіны? Няхай бы пасядзеў *там* месяцы два ці тры, а пасля і выпраўляўся б. Сапраўды — збег, быццам знарок, каб насаліць Просьцы. Насаліць? Нябожчыцы? Нешта не пра тое думае ён…І чаму трэба чакаць год? На Дзяды ён прыедзе да дзяцей, і там яны адправяць гадавіну. Што за праблема? «Не, як ні суцяшай сябе, а паступіў ты, Мацейка, па-хлапечы», — гэта нехта другі ў ім пярэчыць. І тады, быццам згаджаючыся з гэтым «другім», ён бяжыць да суседа і тэлефануе старэйшай дачцэ.

Тая здзіўляецца:

— Што, замаркоціўся?..

— Ну…

— Па маме?

— Дзе ты, дачка, была тады, як я ўзгарэўся пераездам? Чаму не спыніла?

— Ну ты, тата, як дзіця?! Хіба я не адгаворвала?

Ён маўчаў.

— Заўтра ж прыеду да вас. Сяду на поезд і прыеду. Не магу…

У трубцы запікалі кароткія гудкі. «Зазлавала, кінула трубку», — падумаў.

Сустракаць цесця на вакзал ездзіў Міхась. Парукаліся, і зяць паспагадаў:

— Цяжка, мусіць, паміж двух агнёў!..

— Ну што, на могілкі?

— А як жа кветкі? Без іх Праскоўя Іванаўна не прыме…

Купілі кветкі.

Доўга сядзеў Мацей ля жаўтлявага бугарка, застаўленага вянкамі, карзінамі, усланага пачарнелымі ад часу кветкамі. Паклаў свае, свежыя, і быццам ажывіў магілку, узяўся гаварыць з Проськай. Міхась падаўся аглядаць помнікі, чытаць прозвішчы нябожчыкаў і здалёку пачуў ад Мацея:

— Што ты будзеш сланяцца? Едзь, а я пасяджу і прыйду пешшу. Тут недалёка…

Вечарам у даччынай кватэры Мацей забегаў:

— Паеду цяпер, на вячэрнім!.. Там хата без варты, сабаку ж мне не купілі?..

— Куды ты наўпроць ночы? Раніцой цябе і пасадзім у аўтобус.

— Я ўжо дамовіўся з пляменнікам, ён мяне сустрэне і завязе ў Задоры.

— А што ж мама?..

Гэта быў забаронены прыём.

Мацей з крэктам паставіў ля парога сваю дарожную сумку…

Дэкадансу вам у стужку



Людміла РУБЛЕЎСКАЯ

***

Памяці Юрыя Блінова

Кветкі і жвір —
паспрабуй пераліць у санату.
Гукаў нявздзейсненых
не пераўеш у вянкі.
Сонца вышэе,
і спальвае крылы крылатых.
Вецер змяёю слізгае з бяссілай рукі.
Кветкі і жвір —
суразмоўцы не тое, каб надта.
А дакрычацца праз іх да цябе не магу.
Толькі ўзнікае адкульсьць,
усплывае саната,
Што сачыняюць ля смерці —
альбо на бягу.
Смерць абагнаць,
у кашчавае кінуць аблічча
Проста — усмешку…
Ты думаў, даруе яна?
Кветкі і жвір…
Быццам танк Леанарда да Вінчы,
Час абганяе
цяжкая да гукаў труна.
Ноты прабілі раяля драўлянае вечка.
Кветкі і жвір
перасыпалі боль і ману.
Смерць абагнаць…
Неўзнарок…
І апошняю ўсмешкай,
Быццам свяцонаю вербачкай,
нас сцебануць.

***

Кожны, напэўна, хоць раз блукаў па могілках, не ў змозе знайсці чыюсьці магілу і не ведаючы, што час ад часу праходзіць над сваёй.

Шукаць і не знаходзіць знаёмыя магілы
У зарасцях кустоўяў, на тле чужых вянкоў.
Хаваюцца, нібыта пакрыўдзілася: «Мілы,
Што ж доўга не з'яўляўся?
Чаго цяпер прыйшоў?»
Шукаць той лапік глебы,
што быццам прывязаны
Да зніклага аблічча, да вечнае душы…
Захуталіся дрэвы ў гатычныя сутаны.
На помніках партрэты падміргваюць:
«Бяжы!»
Шукаць часцінку праху,
што сталася травою,
Казюркаю, пялёсткам…
А неба ўсё цямней.
Ніхто не застаецца сабою ў перагноі.
А з кім я размаўляю —
не ведаць спакайней.
Нябожчыкаў атрады палеглі,
бы ў казармах.
Пустыя футаралы, разбітыя муры.
Блісне над крыжам зорка,
туман паўзе на мармур.
«Ну, мілы, прывітанне! Знайшоў?
Дык гавары!»

***

Вось так паміраем — таму,
што бракуе цяпла.
Вось так навучаемся шчыра ілгаць
і ўсміхацца.
Нібыта на волі,
ды наша вязніца — са шкла.
Руку працягні — і сустрэнеш сцяну,
а не пальцы.
Мы доўга цярпелі,
чакаючы новай вясны.
А потым увесь каляндар перайшоў
на лацінку.
Мы доўга чакалі, а ўселіся ў крэслы —
Яны,
Не мы, што ніколі не ўмелі гандляраць
на рынку.
Калі нават люты яны назавуць
«сакавік»,
У нас аргументаў аспрэчыць не болей,
чым шчасця.
Мы ў слоікі разам з кампотам
закручваем крык.
А раптам прыдасца? Памрэм —
у каморы загляньце.
Вось так мы адлічваем нашы
шумерскія дні.
Гліняных таблічак накрэсліліі
вам на расстанне.
Вы піце кампоцік, нашчадкі.
А ты не мані,
Дурны каляндар, бо ніколі вясна не настане.

***

Вось такія распаведы, сябра,
за кубкам віна.
Не фалернскага, не — проста танны кагор
з цынамонам.
Абрастае дыпломамі, бы лішаямі, сцяна.
А сапраўдныя знакі — у зморшчынах
вечных бяссонняў.
Вось такія размовы… Мы жалімся —
часу няма.
Масянжовыя твары гадзіннікаў
быццам сцякаюць.
І халодныя рукі аб нас не сагрэе зіма,
Мы не маем цяпла — скразнякамі
выстуджвае памяць.
Слоў сухіх — як галля, што гатовае
ўпасці ў камін, —
У дарунак адсыплем. Мы — вечныя,
з племя адметных
Як іртуць на падлозе, сабраць
немагчыма хвілін —
Хоць адна ды закоціцца ў шчыліну
памяці беднай.

***

Ёй карцела быць птушкай.
Не арліцай, не чаіцай, не канарэйкай,
крый Божа —
Аніякай экзотыкі.
Шэрай, зусім непрыкметнай,
Толькі б птушкай.
З тых істотаў,
Што бульбы не сеюць, ні проса,
Не ткуць, не друкуюць…
І не мэнчацца, ці дасканала
спявалася ўчора.
Ёй карцела быць птушкай.
Ёй гарланяць: дэдлайн!
Дзе артыкул, аповед, малюнак?
У цябе ж зараз лекцыя,
Сходка, планёрка, патоп і халера…
А яна ўсё дзяўбе
Нейкі шэры батон на асфальце,
Потым пырх — і на даху,
І ёй да халеры — халера,
І патоп, і дэдлайн,
І адсутнасць гнязда і кармушкі,
І што Бог не стварыў яе
Чайкай, арлом, канарэйкай.
У далонях Святога Францыска
Стыгматы і зерне.
Хопіць кожнаму птаху.
Пайшлі,
Пазбіраем па пёрку на крылы.

***

Ну што табе яшчэ?
Ты п'еш сярод магіл.
На дзень народзін свой да мёртвага
паэта
Прыйшла. Не супраць ён
паслухаць шоргат крыл
Або твае радкі з прастуджанага лета.
Ну што табе яшчэ?
Даволі слухачоў
На могілках старых, заселеных адменна.
Падставіў твой паэт гранітнае плячо.
Нябожчык пры жыцці быў, кажуць,
джэнтльмэнам.
Ад невідушчых воч пракісне аж віно.
А словы й без таго пракіслі і загаслі.
А што іх шкадаваць?
Змяшаюцца ў адно
Піціво, каб выпраўляць рацыянальнасць
часу.
Каб хтосьці цераз гады — у твой таемны
дзень —
Да помніка прыйшоў іх выдыхнуць у слоту.
Дапіта ўсё віно.
Рукой махае цень.
А заўтра — немата,
А заўтра — на работу.

Яшчэ адзін паэт

Папяровыя птахі злятаюць у студню двара.
Між каменных скрыжаляў у рунах вакон
і плакатаў.
Як няшмат патрабуецца
Для заканчэння дабра
Там, дзе вараць пяльмені і танную
ладзяць гарбату.
Як няшмат патрабуецца,
каб развітацца з сабой,
І з усім пагадзіцца,
што чуеш ад больш сацыяльных.
Папяровыя птахі злятаюць.
Пусцее пакой.
Адгароджаны душы нібыта
пародаю скальнай.
Абібочына ты і лайдак, і нічога няма
На варыўні, пяльмені —
і тыя даеў у суботу.
Ты з усімі згадзіўся,
і з чорнага сшытку дарма
Птушаня папяровае шчыміцца,
просіцца лётаць.
І дзяўбецца радком проста ў сэрца,
крылаты байструк,
Нежаданы, няпрошаны, доказ,
што ты нездаровы.
Крыж ваконнае рамы
Чамусьці выслізвае з рук,
І зніжаецца зграя тваіх груганоў
папяровых.

Жарства вершаў



Зміцер ЗАХАРЭВІЧ

Нянавісць і любоў

Стрэл начны згвалціць цішу,
Цела накрые зямлю…
Мала сказаць: «Ненавіджу!»,
Мусіш прамовіць: «Люблю

Прадзедаў пакаленні
Цёмных, сляпых, як краты…», —
Хай бізунамі памкненні
Знішчылі ў іх праз гады.

Лепшых згубная замець
Склала грама́дамі ў дол —
Тых, каго ў бой не нянавісць
Мужна вяла, а любоў

Да раскіданых гнёздаў
Краю, які выкляў бог,
Дзе паляванне грознае,
Дзе на загонах спалох.

Колькі нас ацалела,
Каб залунаў сцяг наноў? —
На ім між нянавісці белай
Крывёю палае любоў.

…Сталь адзвініць у бітвах,
Вораг астыне ў траве —
Толькі з Любоўю Вялікай
Бацькаўшчына ажыве!

Жарства вершаў

Славаміру Адамовічу

Абурацца,
маркоціцца,
распушчацца ў пытаннях
права поўнае мае
разам з правам
не меціць,
чысты аркуш абрумзаць
слатою
літанняў,
каб вятры
у паветры
павявалі ледзь-ледзь.

Утрапёна сыходзіць
у глыбіні
рэфлексій,
метастазы
метафар
гадаваць у крыві,
праміналуму дню
вымудроўваць
рэквіем
і, ўрэшце
кропку ўцвічыўшы,
прамовіць: «Жыві…».

Сярод гэных узораў
стэрыльных
мастацтва,
якія эстэцкі
расчульваюць
свет,
хіба знойдзецца тое,
што на змену
прыдасца
нашых
змагарных
вершаў жарсцве?

Прамова пра мову

Разагнаўшы аблокі свавольна,
Сонца велічнавокі леў
Залатое свае грывы промні
На мой аркуш апоўдні пральле.

І святло непазбыўнае ўзросціць —
Толькі час увабраць яго дай! —
Чуйных строф трапяткія калоссі
І клінкоў касінеравых сталь.

Вершам тым прабача́ць і прарочыць,
Ацаляючы тых, хто знямог,
Узгараць паходнямі ўночы,
Давідна спапяляючы змрок!

Ім буслямі лунаць па-над Крэвам,
Стаць у хаце ў чырвоны кут,
Вісець шворкай на юдавым дрэве,
Бегчы талай вадой у рыштку.

Малаціць ім цапамі ў стадолах,
Цалавацца ў расе з маладой,
Быць той самай —
праменнаю мовай,
Што нам сонца адвеку дало!

«ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» | № 2 (162) | 28 лютага 2020 | № 8 (667) Новы час

Знайшлі ў Беларусі

На землях Вялікага Княства Літоўскага жылі не толькі ліцьвіны-беларусы і продкі сучасных літоўцаў — жамойты, але і прадстаўнікі іншых народаў. Яшчэ ў часы старажытных беларускіх княстваў нямецкая факторыя (гандлёвае паселішча) існавала ў Полацку. Купцы з Нямеччыны жылі ў Віцебску, Горадні, у падуладных полацкім князям гарадах Герсіка і Куканос на Дзвіне. На пачатку XIV стагоддзя вялікі князь Гедзімін запрасіў у сталічную Вільню рамеснікаў з нямецкіх гарадоў Брэмена і Любека. Дзве тысячы немцаў жылі ў XIX стагоддзі ў Менску. Памятны знак Нямецкай слабадзе ўсталяваны цяпер у сталічным Лютэранскім скверы. Пад націскам тэўтонскіх рыцараў у Вялікае Княства Літоўскае перайшлі тысячы балтаў-прусаў. Пра іх нагадваюць цяпер назвы некалькіх вёсак Прусы ў розных мясцінах Беларусі. Нямала ў нас паселішчаў з назвамі, што сведчаць пра іхніх даўніх жыхароў — латышоў: Латыгава, Латыголічы, Латыгаль, Латышы... Разам з жонкаю вялікага князя Жыгімонта Старога італьянкай Бонай Сфорца да нас прыехала нямала яе суайчыннікаў-прыдворных. У буйных беларускіх гарадах жылі армяне. Менавіта армянін Ян Маджарскі, а затым ягоны сын Лявон кіравалі знакамітай мануфактурай, дзе выраблялі слуцкія паясы. Палякамі з нараджэння, былі дзеячы нашай гісторыі і культуры Сымон Будны, Мацей Казімір Сарбеўскі, Мацей Стрыйкоўскі, Пётар Скарга. Аднак значных перасяленняў палякаў на беларускія землі ніколі не было. Праўда, пасля Люблінскай вуніі, калі Польшча і Вялікае Княства аб'ядналіся ў Рэч Паспалітую, у Літве-Беларусі ўзмацніўся польскі ўплыў і шляхта пачала пераходзіць на мову суседзяў, але паранейшаму лічыла сябе не польскай,а ліцьвінскай. А вось некаторыя несумленныя сучасныя аўтары залічваюць у палякі не толькі шляхту, а і ўсіх беларусаў-каталікоў, якія часта не ведаюць ні польскай мовы, ні польскіх традыцый...



Уладзімір АРЛОЎ

Татары — ваяры і майстры

Ужо восьмае стагоддзе жывуць на беларускай зямлі татары.

Вялікія князі Гедзімін, Кейстут і Альгерд запрашалі татараў на вайсковую службу. Поплеч з рыцарамі-ліцьвінамі яны адбівалі напады тэўтонцаў. Асабліва шмат татараў прыйшло і мірна пасялілася ў Літве-Беларусі ў часы Вітаўта Вялікага. Ён з пашанаю пасяліў у Лідзе хана Залатой Арды Тахтамыша, войскі якога былі разбітыя супернікам Цімурам. Разам з ліцьвінскім войскам Тахтамыш здзейсніў два паспяховыя паходы пад Азоў і ў Крым. Адтуль з параможцамі прыйшлі шматлікія татарскія сем'і, што не прызнавалі ўлады Цімура. Іх пасялілі ў Троцкім, Лідскім, Ашмянскім, Навагрудскім і Берасцейскім паветах. Татары атрымалі зямлю і тыя ж правы, што і астатнія жыхары Вялікага Княства. Ім дазволілі вызнаваць мусульманскую веру і будаваць мячэці.

Перасяленцы з Усходу прысягнулі на вернасць новай Айчыне і былі яе мужнымі абаронцамі. Захаваўся тэкст прысягі, што татары давалі на шаблях вялікаму князю. Яны кляліся быць аддадымі гаспадару і ягоным падданым-ліцьвінам, бо «цяпер у іх агульная зямля, вада і дрэвы». Конніца Джэлал-ад-Дзіна, аднаго з сыноў Тахтамыша, разам з палкамі Вітаўта адважна білася з тэўтонцамі пад Грунвальдам. Татары па-майстэрску карысталіся вяроўкамі-арканамі. Яны сцягвалі з сёдлаў закутых у цяжкія панцыры крыжакоў, і на доле тыя рабіліся бездапаможнымі. Дарэчы, татары ўпэўнены, што якраз іхні вояр забіў у адзінаборстве вялікага магістра Тэўтонскага ордэна Ульрыха фон Юнгінгена.

Шмат татараў вызначылася і ў іншай пераможнай бітве — Аршанскай, дзе войска Вялікага Княства разбіла амаль утрая большыя сілы маскавітаў. У арміі нашай тагачаснай дзяржавы кожны дзясяты быў татарынам. Апрача вайсковай татары спраўна выконвалі кур'ерскую, каравульную і транспартную службы. Прадстаўнікі гэтага народа служылі ў дыпламатычным ведамстве, былі перакладчыкамі і пісарамі ў вялікакняскай канцылярыі.

Дзясяткі татарскіх афіцэраў вызначыліся смеласцю ў паўстанні Тадэвуша Касцюшкі. З татарскага рода паходзіў і сам генерал Якуб Ясінскі, які кіраваў змагарамі на землях Вялікага Княства. Ягонымі паплечнікамі былі татары — камандуючы корпусам Язэп Бяляк і камандзір палка Якуб Азулевіч.

Бальшыня беларускіх татараў належала да шляхты, мела землі, маёнткі, гербы і вольнасці гэтага стану грамадства. Вядомыя каля пяцідзесяці знатных татарскіх родаў: Адамовічы, Ахматовічы, Асановічы, Базараўскія, Бахарэвічы, Дзедулевічы, Завацкія, Канапацкія, Карыцкія, Крычынскія, Малышэвічы, Сабалеўскія, Смольскія, Солтаны, Сяліцкія, Талькоўскія, Улановічы, Халецкія, Эльяшэвічы, Юзефовічы, Юшынскія, Яблонскія, Якубоўскія, Янушэўскія... Шмат нашчадкаў нашых татараў маюць прозвішчы Александровіч, Бабак, Багдановіч, Багушэвіч, Бараноўскі, Заблоцкі, Рамановіч. Магчыма, з гэтага ўсходняга народа паходзяць і вашыя продкі, але — каб высветліць тое — аднаго прозвішча мала, трэба шукаць дадатковыя звесткі ў сямейных і дзяржаўных архівах.

Нямала татараў, што пасяліліся ў вёсках, гарадах і мястэчках, не мелі шляхецкага радаводу, паспяхова займаліся земляробствам і агародніцтвам, славіліся як надзейныя вознікі, майстравітыя гарбары, кушняры, краўцы, ганчары. У XIX стагоддзі сотні татараў жылі ў Пінску, Відзах, Докшыцах, Мядзелі, Глыбокім, Клецку, Навагрудку, Іўі, Смілавічах... Татарская вуліца дагэтуль захавалася ў Вільні. Блізу 500 татараў былі ў той час жыхарамі Менска, дзе існавала цэлае Татарскае прадмесце. Сучасная менская вуліца Дзімітрава раней называлася Вялікай Татарскай, а недалёка, на вуліцы Вызвалення, у 1920-я гады была татарская школа.

Свой след гэтая нацыянальня меншыня пакінула ў найменнях беларускіх паселішчаў: Арда, Апчак, Мамаі, Татарка, Татаршчына, Койданава.

У XVI–XVII стагоддзях татары паступова страцілі сваю мову і пераняли беларускую, узбагаціўшы яе многімі сваімі словамі. Паводле падлікаў філолагаў, такіх слоў некалькі сотняў. Некаторыя сёння здаюцца нам спрадвечна беларускімі: андарак, баран, бязмен, буран, гарбуз, гурт, дзіда, дуда, кабан, кабыла, кавун, каўбаса, курган, сабака, тавар, торба, туман, тытунь, хамут, харч і нават... бусел. Іх лічыў словамі татарскага паходжання мовазнаўца акадэмік Яўхім Карскі.

Загаварыўшы па-беларуску, татары дагэтуль захавалі мусульманскую веру. Надзвычай цікавымі помнікамі пісьменства сталі напісаныя па-беларуску арабскімі літарамі рэлігійныя татарскія кнігі — Кітабы. Існуе і старадаўні беларускамоўны Каран, галоўная кніга мусульман.

Архівістка Вольга Бабкова, якая добра ведае гісторыю нацыянальных мяншыняў Беларусі, высветліла, што ў народнай творчасці пра татараў нельга знайсці анічога крыўднага. Нязлосна, а з добрай зайздрасцю пакеплівалі прадзеды адно з нязменнага татарскага імкнення да чысціні.

З татараў паходзяць прызнаныя дзеячы сучаснай беларускай культуры і навукі: пісьменнік і літаратуразнаўца Сцяпан Александровіч, кампазітар Дзмітрый Смольскі, мастак Ібрагім Гембіцкі, гісторык Ібрагім Канапацкі. Праславіліся нашы суайчыннікі-татары і далёка ад сваёй радзімы. Да прыкладу, татарын з Ліды генерал Мацей Сулькевіч на пачатку XX стагоддзя стаў начальнікам Генеральнага штаба арміі Азербайджанскай Народнай Рэспублікі.

Шэсць стагоддзяў побач

Першыя супольні перасяленцаў з рассеянага па свеце габрэйскага народа з'явіліся ў Вялікім Княстве Літоўскім у XIV стагоддзі. Атайбаваўшыся ў Берасці, Горадні і Троках, габрэі маглі свабодна спавядаць юдэйскую веру, будаваць храмы-сінагогі і займацца рамёствамі ды гандлем. За забойства габрэя чакала такое ж пакаранне, як і за шляхціча.

Адрозна ад заканадаўства заходнееўрапейскіх дзяржаваў, у Вялікім Княстве юдэяў забаранялася вінаваціць у выкарыстанні хрысціянскай крыві. Неяк да гаспадара Вітаўта звярнуліся са скаргай гарадзенскія месцічы: маўляў, габрэі пякуць мацу на крыві дзетак мясцовых жыхароў. Князь загадаў неадкладна паклікаць просьбітаў. Калі тыя з'явіліся, Вітаўт даў кожнаму па вялікім кухонным нажы. У палацавую залу прывялі чародку напалоханых маленькіх габрэйскіх дзяцей. «Рэжце! — крыкнуў угневаны князь. — Вы ж думаеце, што гэта так лёгка — дзіця зарэзаць!». У выніку прысаромленыя мяшчане адклікалі скаргу.

Вялікая хваля габрэяў прыйшла на беларускія землі ў другой палове XVI стагоддзя, калі пачаўся пераслед юдэяў у Польшчы, Нямеччыне і амаль ва ўсіх краінах Заходняй Еўропы. Неўзабаве ў Літве-Беларусі жыло ўжо некалькі дзясяткаў тысяч габрэяў, прычым іхняя колькасць увесь час расла. У некаторых гарадах і мястэчках да юдэяў належаў кожны дзясяты жыхар. А вось у Жамойці, радзіме сучасных літоўцаў, да габрэяў ставіліся вельмі жорстка. Да канца XVIII стагоддзя ім не дазвалялі сяліцца ў гарадах, і юдэі маглі жыць адно ў мястэчках пад апекаю магнатаў.

Габрэі былі пераважна дробнымі рамеснікамі і гандлярамі, хоць між іх знаходзіліся і такія багатыя купцы ды ліхвяры, што маглі ўплываць на агульнадзяржаўныя справы. Падаткі з габрэяў ішлі на ўтрыманне войска, аднак пасля цяжкіх войнаў вялікія князі і каралі часова вызвалялі юдэяў ад выплаты грошай. Як казаў адзін з вялікіх канцлераў, нельга рэзаць курыцу, што нясе залатыя яйкі.

У Масковіі стаўленне да габрэяў было зусім іншае. Калі ў час Інфлянцкай вайны войска маскоўскага князя Івана Жахлівага захапіла Полацак, жыхароў-юдэяў — ад старога да малога — патапілі пад лёдам Дзвіны і Валовай азярыны. У часы «крывавага патопу» сярэдзіны XVII стагоддзя, рухаючыся па Беларусі, стральцы цара Аляксея Міхайлавіча зноў жа бязлітасна знішчалі на сваім шляху ўсіх габрэяў, што траплялі ім у рукі. Асаблівай лютасцю і зверствамі вызначаліся тагачасныя царскія хаўруснікі — украінскія казакі. Але габрэі маглі пастаяць за сябе. У ваенную пару яны поруч з ліцьвінамі баранілі гарадскія валы і муры, адбівалі варожыя штурмы, хадзілі ў конныя і пешыя вылазкі на непрыяцеля. У 1654 годзе болей за тысячу габрэяў праславілася, гераічна абараняючы ад расейскіх акупантаў Стары Быхаў.

Габрэйскім жыццём кіравалі рады-кагáлы. Найбольшымі юдэйскімі супольнямі лічыліся гарадзенская, берасцейкая, пінская і слуцкая. Пазней сталіцай беларускага габрэйства сцвердзіла сябе Вільня. Яе часта называлі усходнім Ерусалімам.

Беларусь стала буйным асяродкам габрэйскай асветы. У XVI стагоддзі былі заснаваныя вышэйшыя навучальні для падрыхтоўкі рабінаў — ешыботы — у Берасці і Горадні. Праславіліся на ўвесь габрэйскі свет ешыботы ў Валожыне, Любавічах, Пінску, Міры, Радуні. У менскім ешыбоце выкладаў выдатны знаўца Торы і Талмуда (святых юдэйскіх кніг) Гейльпрын. Рэлігійную літаратуру выдавалі габрэйскія друкарні ў Шклове і Горадні.

Калі землі Вялікага Княства Літоўскага захапіла Расейская імперыя, габрэі былі абмежаваныя ў правах і маглі жыць толькі ў далучаных заходніх губернях за так званай «мяжой аселасці». Яны плацілі падвойныя дзяржаўныя падаткі, прычым царскія ўлады вынаходзілі ўсё новыя і новыя паборы: на сінагогі, на юдэйскае адзенне, на суботнія свечы. За няўплату падаткаў чакала турма або здача ў рэкруты.

Бальшыня габрэяў па-ранейшаму займалася гандлем і рамёствамі. У 1802 годзе ў Менску было 248 рамеснікаў-юдэяў, у тым ліку 160 краўцоў, 18 шмуклераў (майстроў па вырабу махроў), 16 гарбароў, дзесяць цырульнікаў. Тут працавалі млынары, кавалі, свечнікі, шкляры, гадзіншчыкі, шаўцы, злотнікі, бяльльнікі палотнаў, цесляры, сталяры, шытары (пераплётнікі кніг).

Юдэі не маглі перасяляцца за вызначаную ім мяжу, таму іхняя колькасць у беларускіх губернях няўхільна павялічвалася. Пры канцы XIX стагоддзя іх налічвалася каля мільёна, або15 працэнтаў усіх жыхароў. Габрэі складалі звыш паловы насельніцтва ў Менску, Віцебску, Гомелі, Пінску, Бабруйску... У Магілёве было 38 сінагог і юдэйскіх малітоўных дамоў, у Полацку — 25. Самая старая з беларускіх сінагог, якія захаваліся дасюль — Слонімская, пабудаваная ў 1642 годзе. У ёй пасля рэстаўрацыі плануецца размясціць музей габрэйскай культуры.

Яшчэ больш, чым у гарадах, юдэяў жыло ў мястэчках. Многія з іх амаль цалкам былі населеныя габрэямі. З мовы ідыш, на якой яны гаварылі, да нас прыйшлі словы «квэцаць», «транты», «гвалт», «гармідар», «цымус», «хаўрус», «хеўра»...

Беларускія габрэі далі знакамітых асобаў у самых розных галінах чалавечай дзейнасці. Недалёка ад Стоўбцаў нарадзіўся філосаф Саламон Майман. Механік і гадзіннікавы майстар Еўна Якабсон з Нясвіжа


другую радзіму

сканструяваў у сярэдзіне XVIII стагоддзя лічыльную машыну для матэматычных дзеянняў з дзесяцізначнымі лічбамі. Яе лічаць «прабабуляй» сучасных камп'ютараў. Не толькі родную мову — ідыш, але і беларускую з дзяцінства чуў вакол сябе народжаны ў Капылі класік габрэйскай літаратуры Мендэле Мойхер Сфорым. У мястэчку Пасадзец на Лагойшчыне прыйшоў на свет Самуіл Плаўнік, які стаў класікам беларускага прыгожага пісьменства Змітраком Бядулем. Беларуская зямля — радзіма сусветна вядомых мастакоў Марка Шагала і Хаіма Суціна, скульптара Восіпа Цадкіна.

Старажытную габрэйскую мову — іўрыт, на якой у той час ніхто ў паўсядзённым жыцці не размаўляў, адрадзіў Эліэзер Бен-Егуда з мястэчка Лужкі Дзісенскага павета. Яго называюць «бацькам сучаснага іўрыту». Цяпер іўрыт — дзяржаўная мова Ізраіля. Прэзідэнтамі і прэм'ер-міністрамі гэтай краіны былі народжаныя ў Беларусі Хаім Вейцман, Залман Шазар, Іцхак Шамір, Менахем Бегін і Шымон Перэс. Існуе нават жарт, што Беларусь стала для Ізраіля сапраўднай «кузняй кадраў».

Усе славутыя габрэі з Беларусі ў свой час ведалі мову народа, на чыёй зямлі жылі. Калі ізраільскі прэзідэнт нобелеўскі лаўрэат Шымон Перэс наведваў з візітам Беларусь, на ўрачыстым прыёме, наладжаным у гонар высокага госця, ён прамовіў тост за развіццё беларускай мовы, на якой цудоўна гаварыў у дзяцінстве.

На беларускай зямлі габрэйскія могілкі мелі кожныя горад і мястэчка. На сёння пахаванні юдзяў захаваліся ў Магілёве, Друі, у Глыбокім і недалёкай ад яго Плісе, у Докшыцах, Рубяжэвічах паблізу Стоўбцаў, у мястэчку Ілля Вілейскага раёна, у Паставах і Асіповічах, у мястэчку Ленін Жыткавіцкага раёна, у Ракаве каля Менска...



Страдаўняя сінагога ў Слоніме, сучасны выгляд. Фота С. Плыткевіча

Шкоты з далёкай Шатландыі

Цікавай меншынёй насельніцтва ў Літве-Беларусі былі шкоты (шоты). Яны трапілі да нас з Шатландыі, ратуючыся ад рэлігійнага ўціску з боку англійскага ўрада. На пачатку XVII стагоддзя шкотаў сялілі ў ліцвінскіх гарадах і замках на Дняпры, што страцілі шмат жыхароў у войнах з Масковіяй.

Шкоты вызначаліся дасведчанасцю ў абыходжанні з халоднай і агняпальнай зброяй , і іх ахвотна прымалі на вайсковую службу. У нашым войску, якое ў 1634 годзе трымала ў аблозе заняты расейцамі Смаленск, была цэлая шатландская харугва з двухсот драгунаў.

Перасяленцы з заморскай краіны былі таксама здольнымі гандлярамі. Гістарычныя дакументы таго часу асобна называюць «шкоцкія тавары»: пацеркі, грабяні, ніткі з іголкамі, напарсткі, нажы, ручнікі, панчохі, рукавіцы. Гандаль у шкотаў ішоў так удала, што іх абкладалі дадатковымі падаткамі, каб абараніць інтарэсы мясцовых купцоў.

Даследнік гэтай цікавай старонкі нашай гісторыі Алесь Белы піша, што ў Рэчы Паспалітай шкоты зрабіліся прыкметнай і вядомай у Еўропе часткаю насельніцтва. Яны, да прыкладу, згадваюцца ў творах англійскіх пісьменнікаў. Адных гандляроў-шкотаў у гарадах было прыблізна сарак тысяч.

Шатландзец Джон Хэй стаў адным з самых славутых прафесараў філасофіі Віленскай акадэміі. Перасяленцы з Шатландыі былі кальвіністамі па веравызнанні. Яны найахвотней атабарваліся ў гарадах і мястэчках, падуладных магнатам-кальвіністам. Вялікі гетман Януш Радзівіл і ягоны сын Багуслаў падтрымлівалі грашыма шкотаў, якія пасяліліся ў Слуцку і Кейданах і займаліся навукай, літаратурай і мастацтвам. Адзін з іх, Джонстан, у 1655 годзе выдаў у Амстэрдаме прысвечаную сваім заступнікам-мецэнатам кнігу.

Шкоты паступова засвоілі мову і звычаі ліцьвінаў-беларусаў і ўрэшце зліліся з імі. Сёння пра перасяленцаў-шатландцаў у Беларусі нагадвае адметнае прозвішча іхніх нашчадкаў — Шот. Прызнанне на радзіме і за мяжой здабыў беларускі медык, спецыяліст у хірургіі ды трансплантaлогіі Аляксандр Шот.

Вечныя вандроўнікі

Здаўна жылі ў Літве-Беларусі цыганы. Іхнія продкі некалі прыйшлі ў Еўропу з Індыі.

Першая згадка пра айчынных цыганоў у дакументах датаваная 1501 годам. Яны прывандравалі ў Нясвіж на чале з войтам Васілём. Вялікі князь Аляксандр выдаў Васілю адмысловую грамату-прывілей, у якой абвяшчаў новым падданым «поўную свабоду паводле даўніх правоў і звычаяў і даўніх лістоў князскіх». Гэта значыць, што цыганы з'явіліся ў нас значна раней і мелі прывілеі яшчэ ад папярэднікаў гаспадара Аляксандра на вялікакняскім троне.

Цыганы — у залежнасці ад таго, дзе пасяліліся — прымалі праваслаўную або каталіцкую веру суседзяў. Яны хадзілі ў храмы, адзначалі ўсе хрысціянскія святы, але адначасова моцна трымаліся ўласных традыцый. Ніхто з цыганоў не адмаўляўся і ад роднай мовы, аднак усе ведалі і беларускую.

У халодную пару года цыганы жылі на адным месцы, а з надыходам вясны збіраліся ў табар з трох-пяці сем'яў і выпраўляліся вандраваць. На вяскі гэты народ зарабляў сабе самымі рознымі шляхамі. Мужчыны гандлявалі коньмі (не цураліся і канакрадства), былі спрактыкаванымі кавалямі, гарбарамі, разьбярамі па дрэве, плялі моцныя вялікія кашы, выраблялі з ліпы і дубу адметны прыгожы посуд.

Шляхта нярэдка наймала цыганоў служыць пры стайнях. Яны займаліся гадоўляй коней, лекавалі іхнія хваробы, аб'язджалі маладых наравістых кабыл і жарабцоў. Незаменнымі былі цыганы і ў застоліцах гаспадароў-шляхцічаў, якія любілі пагрэць кроў не толькі віном і хмельным мёдам, але і цыганскаю песняй. Жанчыны-цыганкі славіліся як варажбіткі, знахаркі, цудоўныя танцоркі і спявачкі.

Улады Вялікага Княства і Рэчы Паспалітай спрабавалі прывучыць цыганоў да аселага жыцця. Дзеля гэтага вялікія князі і каралі прызначалі ім старшыняў, што мелі над цыганскай грамадой велізарную ўладу. Гэтых старшыняў менавалі «каралямі». Самым знаным такім валадаром са сталіцай у мястэчку Мір стаў Ян Марцінкевіч. Ён караляваў дванаццаць гадоў і праславіўся дзівацтвамі і схільнасцю да раскошы.

Калі «кароль Ян» збіраўся аглядаць свае ўладанні, з брамы ягонага палацыка зазвычай выязджала вялікая кавалькада. Уперадзе ехалі дзесяць спевакоў і музыкаў, за імі — на пародзістым дарагім кані — страката ўбраны «манарх» з бізуном у руцэ, потым почат (світа) з сямі цыганоў у рознакаляровых апранахах, ад чаго ажно стракацела ўваччу. Затым вялі дванаццаць асядланых коней без седакоў, і нарэшце ў вялізнай старасвецкай карэце-рыдване, запрэжанай васьмерыком коней, рухалася яе вялікасць «каралева». Ва ўсёй гэтай дзіўнай, гаманкой і спеўнай кавалькадзе напоўніцу выяўляўся адвечны цыганскі характар.

У часы Яна Марцінкевіча, якога шчодра падтрымліваў знакаміты князь Радзівіл Пане Каханку, цыганы паспяхова займаліся гаспадарчымі справамі. На кірмашах мелі неблагі прыбытак цыганскія рамеснікі розных спецыяльнасцяў і, зразумела, гандляры коньмі. У Міры цыганы пабудавалі палатняную, суконную і футравую мануфактуры. Але новы «кароль», сын Яна Марцінкевіча, разам са сваімі падданымі праз Украіну і Малдавію адвандраваў у Турцыю.

Нягледзячы на ўсе намаганні, не здолелі назаўсёды прывязаць вольных цыганоў да зямлі і імперскія ўлады.

Супольнае жыццё беларусаў з цыганамі адлюстравалася ў шматлікіх назвах паселішчаў, рэчак, урочышчаў. У Гарадоцкім раёне ёсць вёска Цыганы, паблізу Міра — Цыганская гара, на беразе Дзіны ў наваколлі Віцебска — Цыганскі камень. У розных кутках Беларусі вы сустэнеце Цыганскі ручай і Цыганскую рэчку, Цыганкову ніву, Цыганскія слабодкі.

Расейцы-старaверы

У дзяржаве нашых прадзедаў шмат вякоў мірна жылі побач людзі розных веравызнанняў і нацыянальнасцяў. Іхнія правы былі замацаваныя ў законах і не раз пацвярджаліся. У суседняй Масковіі, а затым у Расеі панавалі зусім іначшыя парадкі. На чужаземцаў ды іншаверцаў глядзелі з падазрэннем. «Няхрышчаным» немцам не дазвалялася заходзіць у царкву, а калі нехта з іх і трапляў туды, яго адразу выганялі і мылі падлогу. У «истинное русское православие» перахрышчвалі праваслаўных беларусаў, прымусова перасяленых на расейскія землі ў часы войнаў. Вы не забылі, што здарылася з біблійнымі кнігамі Францішка Скарыны, калі ён прывёз іх у Маскву і прапанаваў там наладзіць кнігадрук? Так, з гэтых кніг склалі велізарнае вогнішча. Ерась у Маскові шукалі ў кожнай драбніцы і часта вынішчалі іх разам з «вінаватымі». Не было літасці і сваім жа суайчыннікам.

У сярэдзіне XVII стагоддзя маскоўскі патрыярх Нікан увёў у царкоўнае жыццё змены, прынятыя не ўсімі святарамі і вернікамі. Нязгодных назвалі раскольнікамі або стараверамі (стараабраднікамі) і разгарнулі з імі бязлітаснае змаганне. Некалькі дзясяткаў тысяч упартых стараверaў асудзілі на смерць. Пазбавіць жыцця маглі проста за тое, што раскольнік хрысціцца не трыма, як загадаў Нікан, а двума пальцамі. Дваццаць тысяч стараверaў, каб не трапіць на здзекі і катаванне, учынілі самапаленне.

Супраць прыхільнікаў старых традыцый улада вяла сапраўдныя ваенныя дзеянні. Войскі трымалі ў аблозе манастыры, прачэсвалі лясы, каралі смерцю ўзятых у палон «нечестивых врагов государя и церкви». Стараверaў абклалі падвойнымі падаткамі, прымушалі насіць асаблівае адзенне.

Ратуючыся ад праследу, старaверы тысячамі ўцякалі ў верацярпімае Вялікае Княства Літоўскае. Адны сяліліся пераважна на паўночных беларускіх землях Полацкага і Віцебскага ваяводстваў, другія абралі паўднёвы ўсход Беларусі — Мсціслаўскае ваяводства і Рэчыцкі павет Менскага. Сталіцаю перасяленцаў стаў заснаваны імі недалёка ад Гомеля горад Ветка. У ім і ў наваколлі жыло 40 тысяч перасяленцаў з Расеі.

Стараабраднікі вольна займаліся земляробствам, рамёствамі і гандлем, друкавалі забароненыя ў Расеі «ерэтычныя» кнігі. Іхнія цэрквы і манастыры ў багацці часта не саступалі беларускім. Мастакі-стараабраднікі стварылі веткаўскую школу іканапісу, адметна аздаблялі арнаментамі і гравюрамі свае кнігі. Цяпер гэтыя творы можна ўбачыць у Веткаўскім музеі народнай творчасці.

Царскія ўлады былі занепакоеныя масавым пераходам стараверaў у Вялікае Княства і выставілі патрабаванне вярнуць уцекачоў. Калі ў Пецярбург паступіла адмова, там вырашылі перайсці да карных дзеянняў. У 1735 і 1764 гадах царскія войскі двойчы ўрываліся ў нашу дзяржаву і палілі Ветку з навакольнымі слабодамі. Непакорлівых стараверaў тысячамі выводзілі ў Расею, дзе іх чакалі катаванні і высылка ў Сібір.

Калі беларускія землі былі ўжо ў царскай імперыі, былыя ўцекачы, што знайшлі калісьці тут абарону ад праследу, «аддзячылі» новай радзіме сапраўднай здрадай. Яны надзвычай варожа сустрэлі вызвольныя паўстанні 1831 і 1863 гадоў. Стараабраднікі наводзілі карнікаў на лагеры змагароў за свабоду, грамілі маёнткі паўстанцаў, учынялі над імі самасуд.

На Віцебшчыне ў 1863-м сяляне-старaверы сфармавалі конную сотню, што ваявала на баку карных войскаў. У Ковенскай губерні жаданне душыць паўстанцкі рух выказала 600 стараабраднікаў. Яны атрымалі зброю і вызначыліся імпэтам і стараннасцю, за што заслужылі падзяку генерал-губернатара Мураўёва, празванага Вешальнікам. Аднак, як толькі калінoўцы былі разбітыя, імперскія ўлады зноў пачалі прыцясняць стараверaў і першым чынам загадалі ім зруйнаваць збудаваныя напярэдадні і ў час паўстання дваццаць цэркваў.

Цяпер у Беларусі жывуць прыблізна дваццаць тысяч расейцаў-стараверaў. Хочацца спадзявацца, што яны сталі сапраўднымі патрыётамі краіны, якая некалі гасцінна дала прытулак іхнім продкам.

Ворыва



Уладзіслаў РЭЙМАНТ
(1867–1925, лаўрэат Нобелеўскай прэміі)

— У імя Айца, і Сына, і Духа Святога! — урачыста прамовіў селянін і, узнёсла перахрысціўшыся, узяўся за плуг. — Но-о! Ціхутка і з сілай! — і звыкла сцебануў пугай.

Плуг, запрэжаны каровай і трыма людзьмі, урэзаўся ў зямлю і адваліў чорную бліскучую скібу. Глеба была цяжкай, старое канюшынішча — выцертым да апошняй сцяблінкі і ўтрамбаваным як гуменная падлога, — і хаця плуг ішоў неглыбока, скібы атрымліваліся буйнымі і камкаватымі.

Старая, аблічча якой ужо толькі аддалена нагадвала чалавечае, разбівала матыкай цвёрдыя камякі, а за ёй падскоквала некалькі варон, выбіраючы з баразны лічынак.

Ворыва ішло надзвычай цяжка і марудна, плуг быў стары, на колах, ды і запрэжка — вартая жалю: першай парай цягнулі з'яднаныя адным драўляным ярмом жанчына і карова, далей працавалі запрэжаныя ў нешта накшталт шораў рослая дзяўчына і хлопец. Карова выглядала як абцягнуты аблезлай скурай шкілет, людзі былі не больш як ценямі. З іх вачэй вызіраў адзін і той жа доўгі бязлітасны голад; захутаныя ў лахманы, змарнелыя, босыя, яны, аднак, цягнулі згодна, без скаргаў і наракання, са страшным напружаннем прыгінаючыся да зямлі — з такой сілай, што трашчалі гужы і пастронкі.

— Хоць бы са тры ці чатыры моргі агараць! — марыў уголас селянін, які ледзь цягнуўся за плугам.

На галаве ў яго была шапка з аўчыны, на плячах — акраўкі кажуха; хворыя ногі ён абматаў анучамі.

— Жыта няблага пайшло, — зірнуў ён на зеленаватыя палосы, што цягнуліся побач. — Насадзім пад матыку картоплі, пасеем ячменю, гароху са чвэрць, то неяк з Божай дапамогай і перабядуем! Но-о! Но-о! — пакрыкваў ён, з усяе моцы штурхаючы плуг.

— І пад лён жа трэ' хоць пару палос, і пад капусту, — ціха нагадала яму дзяўчына.

— А ці не забралі тое насенне? — умяшалася жанчына. — Былі ў мяне для сяйва і на тую кроплю алею. Дабраліся да іх рыхтык да мёду. Марнуюць толькі ўсё — дый годзе!

— Зноў збіраецца на дождж! Казаў я табе, Магда, — спусці з жыта ваду, бо выгніла пры барознах. Ідзе дождж, ідзе! — выгаворваў жонцы селянін.

Красавіцкая раніца, абяцаючы спярша пагодны і ясны дзень, неўзабаве пазмрачнела: паплылі хмары, бледнае сонца праглядалася скрозь смугу як аплатка. Вакол, куды ні кінь вокам, цягнуліся шэрыя замглёныя роўнядзі, дзе-нідзе адзначаныя шызымі палотнішчамі паводак і купкамі дрэў. Да зямлі ўжо злёгку дакранулася першае вясновае цяпло: вербы павыпускалі пупышкі, на лугах залаціліся лотаці, у ярах расплюшчвалі вочы маргарыткі, зелянелі азімыя і ад ранку да ночы спявалі жаўрукі, — але на палях было яшчэ шэра, пуста і па-дзіўнаму маркотна. У сэрцах людзей не было радасці, і над светам лунала магільная ціша.

— Хто жывы — выходзіць на работу! — зазначыў селянін, калі, дабраўшыся да мяжа, павярнуў на вёску.

Ніхто не адказаў: усе ледзь дыхалі, прысеўшы на мяжы.

— І на маёнткавым працуюць! Ажно чатыры пары, парад дый годзе! — са спачуваннем прашаптаў ён.

— Пра гаспадарскую шкуру не турбуйся, неяк справяцца, — прабурчала жанчына. — Яшчэ і сялянам загадаюць дапамагаць з ворывам. Было ж так у час жніва? — яе перапаўняла злосць.

— Было-та было, але ж не задарма, плацілі ж...

— Ага, колькі ім хацелася. А прымушалі маёнткам дапамагаць, як у часы паншчыны, — прыгадвала яна.

— Ат, шкода часу! Цягніце! У Томка ўжо і ячмень барануюць! — заўважыў селянін, зірнуўшы налева.

— Падара́ў да зімы, то цяпер сам і з каровай справіцца. А я цябе, дальбог, хіба не ўгаворвала: ары, Войтэк! Конь быў і часу хапала. А ты ўсё па кірмашах ездзіў ды па корчмах з рознымі шэльмамі засядаў, а цяпер на нас з дзецьмі арэш. Як быдла, дальбог!

— Твая праўда, жонка, твая праўда, — пакорліва пагадзіўся селянін. — Хутчэй, думаў, я сам пампу, чым увесну без каня застануся, — пакутліва прастагнаў ён.

Яны рухаліся ў бок вёскі. Расцягнуўшыся ўпоперак палёў, на ціхім схіле пад сонцам ляжалі сады, сярод якіх густа тырчалі голыя коміны, шкілеты спаленых хацін і разваленыя будыніны. Палова вёскі была ў руінах. Маёнтак, што стаяў справа за вялікай сажалкай, чарнеў купай разбітых сцен, цэглы і паламаных дахаў, а ад вялізнага парку засталіся толькі вартыя жалю куксы пазбіваных стрэламі дрэў — быццам кулакі, што пагражаюць небу. Там прайшлася вайна, і ўсюды былі заўважныя сляды яе бязлітасных кіпцюроў. Падрала вёскі, выламала лясы, здратавала палі і на месцы ўраджайных зямель пакінула мярзотныя жоўтыя акопы і бясконцыя шэрагі магіл, абсаджаных белымі дрэўцамі крыжоў.

— Ваўрон арэ двума каровамі, — загаварыў хлопец, трошкі з гэтай нагоды прыпыніўшыся.

— А ты сачы за работай, а не за чужымі хвастамі, — пачуў ён разам з посвістам пугі адказ.

Усе замоўклі, настойліва цягнучы плуг і прыгладаючыся, як неўзабаве выходзіць на працу ўся вёска: на кожным палетку ўжо нехта варушыўся. У шэрым засмужаным паветры людзі ціха мітусіліся, бы тыя мурашкі, — няспешна і рупліва. Усе аралі, сеялі ці баранавалі — хто канём, хто каровай, а хто і людской запрэжкай. Былі і такія, што з маркотнай заўзятасцю драпалі тую святую зямлю, быццам голымі пазногцямі, аднымі рыдлёўкамі.

— Божа мой, а ў іншы год на працу выходзіла сто коней! — уздыхнуў мужык.

— А якія ж то былі спевы, воклічы, гавэнды! Гэх! — ціха прыгадала дзяўчына.

— Пан Езус ведае, што робіць! — замармытала старая, прысядаючы на скібу, калі ўсе прыпыніліся трохі ўзнавіць сілы і дыханне. — Столькі развялося брыды, што мусіла прыйсці і кара! Скорацца, паскуды, скорацца! Адзін перад адным выхваляліся і фанабэрыліся! У моргі толькі верылі ды ў поўныя торбы! Ні ў грош не ставілі беднага, ні ў грош справядлівага. І вось знішчаны ў свеце той, што сыпаў рублямі. Даў вам Пан Езус рады!

— Але і годным людзям зрабілася нямала крыўды! — паспешліва ўмяшалася маладзейшая.

Яны зноў аралі ў глыбокім маўчанні, селянін узважваў словы бабкі і старанна згадваў, што мае на сумленні і чым заслужыў такую кару, ажно ўрэшце цвёрда сказаў:

— Паны сабе ваююць, а селянін атрымлівае ў косці.

Ён сплюнуў і выцяў карову так, што тая зарыкала.

— Гэта ж апошняя скацінка, чалавеча! — паспрабавала супакоіць яго жанчына.

— Ціха! Но-о, паскуды, а то паперабіваю косці! — злаваўся селянін.

— Татачка, бацяны прыляцелі! — закрычаў хлопец, паказваючы рукой. — Бацяны, дальбог!

Яны прыпыніліся,назіраючы за бусламі, што кружылі над зруйнаваным маёнткам і паркам.

— Дзе ж яны сабе зробяць гнёзды, дзе? — спачувальна ўздыхнула жанчына. — Бедныя сіроты!

— Нават той сухой тапалі не пакінулі. Усё ім перашкаджала! — глуха буркатаў селянін.

Буслы апусціліся на паплавы, нейкі сабака з радасным брэхам нёсся да іх. Усім зрабілася неяк весялей, быццам з прылётам буслоў у сэрцах заквітнела надзея.

— Цягнемо, людзі! Не круці галавой, Юзік, а то атрымаеш пугай, — лаяўся селянін, але злосць ужо знікла: ён сам штохвіліны паварочваўся да паплавоў і нешта сабе мармытаў. — Калі бацяны вяртаюцца ў свае гнёзды, вайна адлятае! — пераканана прамовіў ён.

І вось ка́ркі зноў аддаліся ярму, плечы згорбіліся, ногі ўбіліся ў зямлю, і людзі ў глухім маўчанні пацягнулі плуг. Тут неба пацямнела і пачаў падаць дробны надакучлівы дождж. Сыпаў ён шчодра, нібы праз сіта, накрываючы свет чымсьці накшталт дрыготкай эмалі, халадам, што працінаў да касцей, і вільгаццю. Вясновая непагадзь разышлася не на жарт, і араць рабілася ўсё больш цяжка і пакутліва: слізгалі ногі, раз-пораз хтосьці падаў носам у зямлю, сілы сыходзілі, ярмо вярэдзіла карак, а пастронкі аж да крыві ўразаліся дзецям у плечы і грудзі. Людзі, аднак, цягнулі без стогнаў і скаргаў, кульгаючы і ўвесь час мяняючыся месцамі ў запрэжцы. Селянін падмяняў усіх па чарзе, а за плуг станавілася то жонка, то дачка, то сын. Надта гэта не дапамагала, праца ішла ўсё цяжэй, і кожная нанова адваленая скіба брыняла, здавалася, не столькі дажджавой вадой, колькі потам і крывёй страшных намаганняў. У некаторыя моманты, калі ўжо не хапала дыхання, людзі дзе папала валіліся на зямлю і ляжалі як забітыя жывёлы, мёртвыя, нібы бярвёны, ужо зусім нічога не ўсведамляючы.

Адпачывалі яны нядоўга, бо няўхільная неабходнасць зноў упрагала іх у ярмо, змушаючы да крывавай працы. За імі неадступна крочыла застрашлівая здань голаду, паганяючы пугай роспачы.

— Сіўкам я б ужо даўным-даўно ўсё заараў! — вырвалася ў селяніна.

Сэрцы агарнуў раптоўны боль, выціскаючы з вачэй слёзы горкіх успамінаў.

— А я ж ім казаў праўду: мыт у яго і ліхаманка. А яны не паверылі! Бо ж на вока конь як маляваны — сам рослы, ідзе як рысак. Пасля тых, з маёнтка, то яно і не дзіўна. Я і ў ножкі кланяўся. Не губіце, кажу, гэта ж наш карміцель. Дзесяць моргаў поля, шэсць чалавек у сям'і, вось-вось вясна, кажу. Як жа мы, сіроты, без каня справімся, кажу. А яны там пашчабяталі і забралі, — ужо, можа, тысячны раз паўтараў селянін. Тая хвіля, калі ён згубіў каня, ніяк не ішла ў яго з галавы. Гэта была незагойная рана, праз якую спывала яго жыццё. — Такі быў конь! Яцэк даваў мне за яго пару каштанавых, а я без даплаты не хацеў...

Тут карова звалілася, жанчыны кінуліся ў плач і пабеглі на дапамогу. На шчасце, нічога не здарылася, і карову паднялі на ногі.

— Рыжуля! Дальбог! Рыжуля! — лямантавала жанчына, выціраючы з яе бруд і песцячы, як самае дарагое дзіця. — Яшчэ згубіць апошнюю кроплю малака.

— Мы і так жарэм тое, да чаго не дакрануліся б нават свінні!

— Калі быдлу не смакуе морква, хай ідзе к чорту!

— Зараз я пакажу табе лепшую жратву, пачакай у мяне! — крыкнуў селянін, сцябаючы пугай порткі сына.

— Не біце, а то я ўсё кіну і пайду ў белы свет! — плаксіва прыгразіў хлопец.

— То адным ротам будзе менш! Ідзі вандруй, сынку! Маці збярэ табе торбачку. Не турбуйся, назбіраеш чаго, хоць кіёў у спіну, але назбіраеш! А можа, прыстанеш да салдат? Гэта якраз для цябе — нішчыць, і красці, і паліць. Ідзі, сынку! — мармытаў селянін, якога словы сына закранулі за жывое.

— Ды я ж гэта так сабе, а бацька ўжо кідаецца, як на таго лютага сабаку! Ведаеце, што, — хлопец раптам змяніў тэму, — а сіўка наш салдат баяўся!

— Дурань ты! Каб такі конь і чаго баяўся! — селянін амаль абразіўся.

— Ды праўда! Улетку паехаў я ў каторую ноч на яры ў маёнткавай канюшыне. Былі там і іншыя хлопцы. Коней мы трымалі на пастронках, падрыхтаванымі. Але ўсё адно на світанні заспеў нас палявы вартаўнік. Не біў і коней не адбіраў, а толькі крыкнуў: "Праз лес валяць маскалі!" І паехаў наперад, а мы ўсе — за ім. Сталі мы ў падлеску над дарогай. Божа мой, які там быў натоўп, штыкі калыхаліся рыхтык жыта на паласе, а наш сіўка як задзярэ хвост і як паганіць напрасткі! Скінуў мяне ў ярах і паімчаў да хаціны.

— Дык гэта, значыць, усё ты! Цяпер разумею, чаму конь усю нядзелю жэрці не хацеў, а толькі піў ды енчыў. Я яшчэ галаву ламаў. Ну пачакай, зараз ты за гэта атрымаеш!..

— Досыць, дурні! — стала на абарону сына маці. — Спрачаюцца тут пра мінулагодні снег!

— Без лупцоўкі не сыйдзе — дзеля парадку, каб шанаваў каня! — паабяцаў бацька.

Аднак на гэтым усё і скончылася — сям'я адразу ж успомніла страчанага каня і пасмутнела. Раз-пораз нехта прыгадваў розныя гісторыі, што сведчылі пра яго вартасці, прыгажосць і прывязанасць да дому. Каня згадвалі з такім гарачым сумам, быццам ён быў кімсьці дарагім і блізкім і цяпер навекі згубленым...

— Ведаеце, што, — загаварыла пасля адпачынку дзяўчына. — Мне ўжо не раз уначы здавалася, што сіўка іржэ пад хацінай. Я ўжо была думала, што гэта ўсё мне ў сне прымроілася! Вось і пазаўчора ноччу, як я прачнулася, то выразна пачула: іржэ наш кося! Выходжу па патрэбе на двор і гляджу: сіўка, не сіўка? Перахрысцілася і праціраю вочы: штосьці белае рухаецца пад стайняй! Ну, думаю, уцёк ад тых зладзеяў і вярнуўся дадому! Я туды бягом, аж раптам на ветры імгла закруцілася — усё адразу і знікла. Толькі на дарозе нешта загрукала і ў Ваўронаў сабака забегаў і забрахаў. Мне ад страху ажно кепска зрабілася. Можа, здох ён і цяпер бадзяецца па начах, сваіх шукае...

— Коні што, будуць пасля смерці прыходзіць, як тыя пакутныя душы? — пачала лаяцца маці...

Яны замаўчалі. Дождж узмацніўся, у барознах ужо паблісквала вада і пад нагамі асядала зямля, а кожную скібу даводзілася адвальваць з усё большымі высілкамі. Аднак яны бесперастанку аралі. Ажно вылазілі вочы, ад ярма і пастронкаў выступала кроў, дзіўна хрумсцелі косці і мутнела ў галовах — але селянін няўхільна гнаў запрэжку наперад.

— Забіце мяне, а ўжо не магу! — застагнала дзяўчына, падаючы на зямлю.

Усе прыселі побач: маці абцірала ёй твар, а бацька ўгаворваў:

— Што ты тут зробіш! Адпачні, дачушка! Нэндза нас гоніць. Каб жа хоць паўморга пад картоплі зааргць. Хто не пасее, той не збярэ. Нам што, з голаду падыхаць ці ісці са сваёй зямлі ў свет па жабрачы хлеб? Не дачакаецеся, паскуды! Не дачакаецеся! — закрычаў ён і, сціснуўшы кулакі, пагрозліва бліснуў вачыма.

З бясконцай упартасцю яны аралі далей.

З польскай мовы пераклала Ганна Янкута

А бацька ўсё садзіў таполі…



Мікола СЯНКЕВІЧ

…Мой вячэрні званок у вёску. Гэта ўжо пасля бацькавага інфаркту і анкалагічнай аперацыі. Як і заўсёды, трубку падымае маці. Адразу пасля прывітання адказвае на галоўнае ў такіх выпадках пытанне, не чакаючы яго:

— Накарміла тату, а сама адарвалася на некалькі гадзін пакапаць бульбы да Дзяніса Б. У яго сажалка, мо дасць для таты свежай рыбы…

Прыкладна з гэтага пачыналася ў той цяжкі для ўсіх нас кожная размова. Маці нібы «адчытвалася» перад сынамі: за бацьку не хвалюйцеся, я ўсё зраблю сама. А іншы раз і так супакоіць: «Рада, што хоць з хаты выйдзе і мною пакамандуе».

У той час яе найбольшым жаданнем было, каб гэтае «выйдзе з хаты і пакамандуе» працягвалася як мага далей.

Выразны ўспамін дзяцінства — бацькавы чобаты. Не ведаю чаму (мо на ўкраінскі лад), ён называў іх «лыты», і слова гэтае здавалася нейкім асаблівым. («Пераходзіў грэблю і зачарпнуў вады ў «лыты».) З непад'ёмнымі, на паўкухні лытамі мы з малодшым братам, можна сказаць, і гадаваліся. Лыты з'яўляліся на сваім нязменным месцы ў красавіку, калі ўсё залівала вада і бацька выганяў калгасны статак на пашу, і знікалі толькі з першымі прымаразкамі. Напачатку, у першыя год-два пасля перасялення з хутара Паянтрога ў вёску, боты даходзілі нам, дзецям, лічы што да вушэй.

Гады праз два, калі я ўжо заканчваў пачатковую школу, гумовікі крыху «паменшалі», але і тады яшчэ даставалі да пояса, і ўступіць у іх, крыху прасунуць па падлозе ўдавалася з вялікай цяжкасцю. Боты, здавалася, былі налітыя свінцом, і я не мог уцяміць, як гэта іх можна насіць цэлы дзень — не здымаючы.

Ох і цяжкія былі тыя лыты! Падэшва ледзь не ў цагліну таўшчынёю, а гума на халявах такая, што чобаты абсалютна не згіналіся пры хадзьбе. Чорныя бацькавы лыты пахлі балотам, лазою, тытунём, дымам…

Боты зніклі тады, як бацька (а было яму пад сорак) пайшоў «вучыцца на трактарыста». Спачатку яны пыліліся ў сенях, а пасля і наогул недзе зніклі з вачэй — агромністыя бацькавы чобаты, у якіх пастуху ўдавалася «вы́хадзіць» за месяц свае паўсотні, і то не заўсёды, рублёў.

Бацька не паважаў «дурных да працы» аднавяскоўцаў. У яго была мудрая прыгаворка «Заўтра будзе дзень!», з акцэнтам на першым слове. Гэта значыць, не гарыць, не канец свету. Заўтра няспешна давядзеш пачатае да ладу ды яшчэ ў выйгрышы застанешся…

Было гэта, памятаю, неўзабаве пасля таго, калі я вярнуўся з войска. У некага з родзічаў талакою клалі стажок — вялікі, тоны на тры. Вілы ў нядаўняга танкіста аказаліся бацькавай работы, спраўныя, лёгкія. Нанізаў на іх столькі, што паясніца трашчыць, рукі хадуном ходзяць. Намогся — і кінуў сена на стажок. Ажно нехта са старэйшых мужчын не вытрымаў: во гэта пада́ў дык пада́ў. Я, каб зрабіць прыемнае бацьку, пачаў старацца яшчэ больш. А ён вылучыў момант, калі нас нікто не чуў і не бачыў за стогам, нягучна параіў, нібыта раскрыў жыццёвую тайну: «Не рвіся! Глядзі, як усе… Нажывеш кілу — нікому не будзеш патрэбны…»

Аберагаў, хваляваўся за дарослае дзіця.

Дарэчы, сам ён згаданага вышэй прынцыпу наўрад ці трымаўся. Ордэн Працоўнай Славы ўручалі далёка не кожнаму. Я ўжо не кажу пра ягоныя юбілейныя медалі і граматы, здымкі на Дошцы гонару… І ад грыжы не ўбярогся, нягледзячы на сваю разважнасць і разумную няспешнасць. Гэта мне ўжо знаёмы доктар расказаў, перад першай бацькавай аперацыяй.

Летам, у нядзелю ці ў святочны дзень, пасля абеду, бацька звычайна браў у рукі «куфайку» ды ішоў у таполі, пасаджаныя ім на краі сядзібы, выспацца, адпачыць. Выдатна памятаю, як і мне самому ў касавіцу салодка было ў абед заснуць пад адкрытым небам на падкінутым лахмане… Побач заўсёды быў бацька: кляпаў косы, курыў, перадрэмліваў.

Неаднойчы спрабаваў — ужо без яго — паабедаўшы, стуліць павекі пад яблынямі на сваіх «сотках» — і кожны раз не атрымлівалася. Не ўмею выбраць месца, ці што?.. А то яшчэ, сорам прызнацца, прыходзіць думка, што нейкая змяюка можа падпаўзці і ўджаліць соннага.

Бацька неаднойчы казаў: калі стануць пакідаць сілы, пачну рэзаць на дровы таполі. А сам усё саджаў новыя. З тых, першых, што выраслі да неба, паспеў зрэзаць і ўпарадкаваць ўсяго толькі тры…

У наступныя тры гады пасля свайго сямідзесяцігоддзя.

У бацькоўскай хаце кожны раз маю ўвагу прыцягваюць два ладныя цвікі ў бэльцы, бліжэй да грубкі. Яны забіты крыху наўкос, строга адзін пад адным.

Да гэтага часу памятаю стук малатка ў бацькавых руках, глухі адгалосак столі. Трыццаць сем гадоў прайшло — акурат столькі цяпер маёй дачцэ і яго першай унучцы. У хаце дзеда і бабы разам з маці перажыла яна сваю першую зіму. Дзіцё ўрадзілася крыклівым, у ложку не засынала. Привезеная з горада каляска разламалася праз два дні, бо трэслі яе не перастаючы. І тут бацька згадаў пра калыску на гарышчы, у якой калыхалі яшчэ нас з малодшым братам. Менавіта тады і загнаў ён у дубовую бэльку моцны і доўгі, з пядзю, цвік. А крышачку ніжэй — яшчэ адзін: на ўсякі выпадак, каб было надзейна…

Мне ніколі не прыходзіла на думку выцягнуць з бэлькі старыя, многа разоў пакрытыя белай фарбай цвікі.



Фота www.kurjer.info

Калі я быў малым, бацька здаваўся мне высокага росту і вельмі дужым. А пасля высвілася, што росту і целаскладу ён самага звычайнага. А вось што, як пісаў Колас, «карчавіты і няўломак» — гэта адназначна. Трывушчы, ён без наракання пераносіў дождж і вецер, зімовую сцюжу і летнюю спёку…

Зграбаем сена. Бацька ўжо дабіраецца да сярэдзіны сёмага дзясятка, мне, гараджаніну, няма і сарака. Задуха невыносная. Каб крыху астудзіць разагрэтае цела, я раз-пораз адбягаю ў зарослы стары роў. Там зусім мала вады. Зверху яна цёплая, але можна дабрацца падэшвамі да халоднага глею і пастаяць хвіліну-другую.

Нарэшце сена згрэблена, распачаты стажок. Цяпер аднаму трэба таптаць яго, а другому брацца за вілы. Уверсе намнога лягчэй: аднекуль бярэцца ветрык, ды і раскладваць сена вакол сябе, наступаць на яго, — зусім не тое, што рваць жылы, падаючы «навільнікі». Выдатна ўсведамляю ўсё гэта, але ў мяне няма сілы проста стаяць, не тое, каб класці стог.

Як і ва ўсе папярэднія гады, бацька без адзінага слова ўбіў вілы ў пачаты стог, каб мне зручней было ўсцягнуцца наверх, пачакаў, пакуль вытапчу сярэдзіну ды абыду «аколіцу», і звыкла, няспешна стаў падаваць сена. Ён і падумаць не мог, што можа быць інакш, нават не здагадваўся пра мукі сумлення гарадскога дзіцяці…

Глядзеў на пастарэлага бацьку і здзіўляўся: кашуля ў яго была зусім сухая, толькі пад пахамі выступілі дзве круглыя цёмныя пляміны. І гэта ў той час, як мая, расхрыстаная, мокрая, бы той квач, ляпілася да цела і перашкаджала рухацца. Да ўсяго, салёны пот выядаў вочы, і я не паспяваў выціраць яго шапкай з доўгім брылём. А ён сваю, паўсядзённую, толькі ссунуў далей на патыліцу…

Так і не зраўняўся з ім у касьбе да ягоных сямідзесяці, да першага інфаркта і невылечнай хваробы ўслед за ім. Нават тады бацька касіў ад узыходу сонца і гадзін да дзесяці-адзінаццаці, пакуль ранішняя прахалода дазваляла дыхаць, а пасля вяртаўся дамоў, шукаў, да чаго можна прыкласці рукі…

Жыццёвых сіл хапіла яшчэ на тры гады.

У маладосці бацька катаў валёнкі, быў ці не адзіным майстрам на ўсю ваколіцу. Занятак свой ён пачынаў далёка пад зіму. Па вечарах з шырокага нефарбаванага стала на кухні здымаўся настольнік. Маці рассцілала мокрую палатніну. На ёй роўным слоем клалі чыстую, добра вычасаную воўну, а зверху, пасярэдзіне, — цыратовую выкрайку, якая абгортвалася воўнай і той самай палатнінай. Усё разам скручвалася ў трубку і каталася (спачатку вельмі асцярожна, а пасля ўсё смялей і смялей) — згортвалася і разгортвалася незлічонную колькасць разоў, па некалькі гадзін запар. Маці час ад часу ліла зверху гарачую ваду.

Калі палатно здымалася, па тым, што аддалена нагадвала валёнкі, яшчэ доўга бразгацеў узад-уперад адмысловы жалезны агрэгат бацькавай канструкцыі: чатыры рабрыстыя валкі, замацаваныя па два на кожнай восі. Валёнкі ўкатваліся да патрэбных памераў, і тады бацька ўстаўляў у іх «калодкі» — асобна для ступні і для верха. Пасля гэтага ён пачынаў біць валёнкі драўляным валком і кулакамі, церці іх далонямі…

Каб пераняць вопыт, бацька спецыяльна ездзіў на фабрыку (ужо і не памятаю, якую). Прывёз адтуль «фабрычныя» калодкі, праўда, застаўся вельмі незадаволены імі, — усё нешта падганяў, падстругваў нажом і вострым аскепкам шкла, набіваў з бакоў кавалачкі гумы.

«Рукі паадбіваць!..» — абураўся ён услых. Ну, аніяк не суадносіліся калодкі-ступні з нагамі бацькавых заказчыкаў. Хапала марокі і з калодкамі верху. А ўсё таму, што яны прамыя, а лыткі, «пад'ёмы» ў кожнай жаночыны адметныя. Вось і паспрабуй тут дагадзі з фабрычнай геаметрыяй.

Далей валёнкі фарбаваліся і займалі сваё месца на грубцы.

Прыходзілі заказчыкі, доўга мералі. Калі абутак быў цесны, даводзілася расцягваць: намочваць, заганяць большыя калодкі, зноў сушыць.

Неаднойчы наракаў бацька на той дзень, калі ўзяўся за свой няўдзячны занятак. Многа разоў даваў сабе зарок: «У апошні раз», — і зноўку не мог адмовіць, бо прасілі ў асноўным шматлікія родзічы і знаёмыя.

Для мяне асабіста найцікавей было, калі задаволены ўладальнік новага абутку даставаў прынесеную пляшку (іншы раз маці дадавала сваю), і павесялелыя дарослыя маракавалі над праблемамі жыцця-быцця, жартавалі, смяяліся. Абноўку заказчыкі пакавалі звычайна ў клятчастую хустку, завязваючы яе канцы намітусь, зычліва прыгаворвалі: «Каб вы мелі карысць з грошай, а мы з абутку…».

Тыя калодкі доўга ляжалі на гарышчы. Нават шашаль не браў іх, многа разоў прапараных і перафарбаваных. А пасля недзе зніклі, як знікае ўсё ў гэтым свеце.

А маці бачыла татаву душу і ў гэтым пераканала нас, сыноў. Прыйшла, кажа, з вуліцы, а на тым месцы, дзе стаяла труна, сядзіць птушачка. Нейкая зусім незнаёмая, нябачаная раней. Хацела мама паклікаць суседку Надзю, ды нешта перадумала. Адчыніла дзверы ў сенцы, і птушка няспешна вылецела. Мама толькі перахрысціла яе ўслед.

Праз дзевяць дзён, як не стала бацькі.

Бацька ўжо зусім слабы, не выходзіць з хаты. Больш за ўсё ён перажывае за тое, што няма моцы працаваць. Збіраюся ісці касіць, і тут ён нечакана прыгадвае, што адна з найбольш зручных касаў «адыходзіць». Па яго просьбе прыношу ў хату малаток, новы клін-затулак, якіх назапашана на дзесяць гадоў наперад, нож-складанчык. Сачу за аслабелымі бацькавымі рукамі — і нейкае дзіўнае, неспазнанае раней адчуванне пранізвае свядомасць, падганяе да горла даўкі камяк. І віной усяму яна, адкляпаная, з бліскучым лязом каса ў чыстым пакоі, дзе не павінна быць.

Бацька падагнаў новы затулак, падказаў, што касе «даўгавала».

У гэты дзень ён знайшоў яшчэ сілы тое-сёе падрэзаць, падправіць, падладзіць. Ужо ўвечары з палёгкаю адзначыў: сёння, дзеці, я зрабіў чатыры работы…

Выпадкова пачуў, як бацька «прызнаваўся» маці ў каханні.

Аднаго разу ў няшумным застоллі ў нашай хаце размова перакінулася на жанок. Бацька, які звыкла маўчаў, на гэты раз глыбакадумна заўважыў (сам сабе, не для гасцей): «А як мая Лена, то лепшых жонак і не трэба».

Так і пражылі яны паўвеку без «любові» ды «кахання».

А маці і праз трынаццаць гадоў пасля адыходу гаспадара паліць у печы нарыхтаванымі ім дровамі і скрушна ўздыхае: «Ён мяне шкадаваў. Думаў, што мо самой давядзецца ўжо. Усё дровамі заклаў. А яго таполі цяпер такія, што да іх і не падступішся».

На крылах жарсці — да паэзіі вяршынь



Эдуард ДУБЯНЕЦКІ

Анхела Эспіноса РУІС. Колер крылаў: паэзія і проза. — Мінск: Кнігазбор, 2019. — 248 с. (Бібліятэка Саюза беларускіх пісьменнікаў «Кнігарня пісьменніка»; вып. 116).

У гісторыі сусветнай і айчыннай літаратуры было нямала выпадкаў, калі пісьменнікі, ад нараджэння выхаваныя ў адной этнамоўнай традыцыі, спачатку пачыналі ствараць свае творы на роднай мове, а затым па розных прычынах пераходзілі на мовы іншых народаў свету. Прычым нярэдка такія іншамоўныя тэксты мелі заўважную мастацкую каштоўнасць і тым самым уносілі пэўны ўклад у развіццё «нярodных» для творцаў культур і літаратур. У сучаснай беларускай паэзіі да праяў гэтага адмысловага мастацкага феномена можна аднесці, скажам, творчасць Алеся Разанава, які некаторыя свае вершы напісаў па-нямецку і па-літоўску, ці Фелікса Батарына, які піша вершы не толькі па-беларуску, але і на ідыш.

Аднак самым свежым і яскравым прыкладам падобнай тэндэнцыі з’яўляецца, безумоўна, творчасць іспанскай (па паходжанні) маладой паэтэсы Анхелы Эспіноса Руіс (нарадзілася ў 1993 годзе), якая на працягу 2010-х гадоў выдатна вывучыла беларускую мову і пачала пісаць на ёй вершы і прозу. На сённяшні дзень у «творчым багажы» адоранай пісьменніцы ўжо ёсць чатыры аўтарскія беларускамоўныя зборнікі і адна кніга перакладаў на іспанскую мову вершаў Максіма Багдановіча. Прычым выданне апошняй па часе выхаду ў свет кнігі «Колер крылаў» (Мінск, «Кнігазбор», 2019), якая ўключае ў сябе выбраныя вершы з папярэдніх зборнікаў, узоры прозы і калумністыкі, стала своеасаблівай узнагародай ёй за атрыманне літаратурнай прэміі імя Міхася Стральцова. Паводле рашэння журы, гэтая прэмія, якую можна лічыць адначасова як сведчаннем пэўных заслуг лаўрэаткі, так і вялікім авансам ёй на будучыню, была ўручана паэтэсе «за пачуццёвае і метафарычнае багацце паэтычнай мовы і адважнае імкненне асэнсаваць таемнасць беларускага жыцця».

Як вынікае са зместу названай кнігі, галоўным матывам паэзіі Анхелы Эспіносы Руіс з’яўляюцца каханне і любоў ва ўсіх іх «абліччах» і праявах. Прычым не дзіўна, што, улічваючы маладосць аўтаркі і яе паўднёвы тэмперамент, каханне гэтае найчасцей аказваецца жарсным, эратычна-плоцкім, а часам нават ледзь не экстатычным. Прычым яму надзвычай эмацыянальная паэтка «аддаецца» амаль дарэшты, не шкадуючы сваіх эмоцый, перажыванняў, фізічных і духоўных сіл. Пісьменніца імкнецца жыць напоўніцу, хоча паспець зрабіць, адчуць і напісаць як мага больш, выявіўшы пры гэтым свой магутны творчы патэнцыял, пра што красамоўна сведчыць канцоўка санэта пад назвай «Паўночны вецер»:


Паўночны вецер, мілае стамленне,
Глухое навальніцы рэзкі шквал,
Злуюся на пагоду, сонца й ранак…

Твой шэпт прынёс і страх,
і захапленне,
Як бард, пяшчотны, грубы,
як вандал,
Мой вікінг, мімалётны
мой каханак.

Своеасаблівай візітнай карткай паэтычнай творчасці Анхелы Эспіносы з’яўляецца надзвычайная экспрэсіўнасць і эмацыянальна-пачуццёвая «зараджанасць» большасці ейных вершаў. Па сутнасці, апошнія ператвараюцца ў бясконцы страсны маналог жаночай душы, які ў адных выпадках пераходзіць з лагодных і ціхіх нот на павышаныя, а ў іншых можа ўвогуле перайсці ледзь не на крык асалоды, шчасця ці, наадварот, адчаю:

Табою кіруе вясна,
А мною кіруюць сакрэты,
Ляцім мы з табой над вадой,
Далёка, як сны, як каметы.
....
Бо намі кіруе Любоў.
Любоў — найвышэйшая сіла.
Змірыцца не можа душа:
Няўжо назаўсёды згубіла?

На маю думку, тлумачэннем такой павышанай эмацыянальнасці аўтаркі з’яўляецца не толькі яе «гарачая» іспанская кроў, але і неўтаймоўны «жыццёвы парыў» (Анры Бергсон), які наўпрост уплывае на змест і характар мастацкай творчасці. Прычым у выпадку Анхелы Эспіносы, можна сказаць, відавочна дамінуе так званы «любоўны парыў», аб чым красамоўна сведчаць яе шматлікія імпульсіўныя, тэмпераментна-парывістыя вершы на тэму кахання й любові да жыцця і прыроды:



Люблю жыццё, паветра ды прыроду,
Цаню маўчанне ды малюся слову,
Таму пяю свае, чужыя оды
На чалавечых і жывёльных мовах.

Увогуле, паэзію Анхелы Эспіносы Руіс можна небеспадстаўна аднесці да своеасаблівай плыні «неарамантызму», для якой уласцівы выключная эмацыйнасць, пачуццёвасць, узвышана-ўзнёслае ўспрыманне жыцця-быцця. І гэта цалкам натуральна, паколькі аўтарка выхоўвалася пераважна на ўзорах рамантычнай паэзіі, а па творчасці двух бліскучых пісьменнікаў-рамантыкаў XIX стагоддзя (іспанскага і беларускага) яна нават абараніла летась дысертацыю пад назвай «Сімвалізм народнага паходжання ў прозе Яна Баршчэўскага і Густава Адольфа Бэкера». Таму і невыпадкова, што ў вышэй згаданым зборніку можна сустрэць наступныя ўзнёсла-фантазійныя радкі, якія даволі нечакана і дзіўна гучаць у нашым прагматычным XXI стагоддзі:

Бывай, о мімалётная маланка!
Бывай, салодка-горкі смак жыцця!
Бывайце, рукі шчырага каханка
І мілагучны голас салаўя!

Яшчэ адной з адметных рыс вершатворчасці іспанскай паэткі з’яўляецца, як ні парадаксальна, беларускі... патрыятызм. Апошні праяўляецца ў шчырай павазе да беларускай мовы, гісторыі і культуры, а таксама ў жаданні зрабіць як мага больш для Беларусі — то бок для сваёй «другой Радзімы». Пры гэтым паказальна, што аўтарка, у адрозненне ад многіх нашых сугрnative...

аўтарка, у адрозненне ад многіх нашых суграмадзян, ніколі не губляе свайго этнакультурнага і гістарычнага аптымізму: «Беларусь будзе жыць там, / дзе памяць, дзе мова й любоў». Дарэчы, такому шчыраму патрыятызму можна нават па-добраму пазайздросціць, паколькі ён сёння вельмі рэдка сустракаецца сярод маладых і сталых жыхароў нашай краіны, якія настроены пераважна песімістычна.

Пры ўважлівым чытанні ў кнізе можна знайсці нямала арыгінальных вобразаў-метафар, якія адразу прыцягваюць увагу, прымушаюць спыніцца, задумацца і па-добраму ўразіцца. Прыкладамі такіх удалых (прычым часам парадаксальных і экзатычных!) метафарычна-афарыстычных выказванняў могуць служыць, напрыклад, наступныя: «Зоркі-чайкі ракою да мора плывуць, / Да нябёс — чарада нерэід...»; «Зіма, як белы павук, / Заткала вокны старажытнымі ўзорамі»; «Ластаўка цэмры ляціць да парога, / Ў ружах губляюцца сны»; «Мяне цалуюць вечнасць і трывога»; «А Час глухі, сляпы / І галодны, як воўк»; «Бо слова — гэта куля, а думка — / Гэта нож, што рэжа мрою»; «Пра будучыню памятаюць паэты й летуценнікі./ Якая будучыня была прыгожая!» ды іншыя. Праўда, акрамя іх у зборніку неаднаразова можна сустрэць і шаблонныя, банальныя вобразы і рыфмы. Да ліку такіх метафар можна аднесці, напрыклад, шырока распаўсюджаны яшчэ з антычных часоў вобраз палёту на крылах чалавека ці ягонай душы, здаўна вядомае параўнанне сябе ці сваёй лірычнай гераіні/героя з птушкай, а таксама «збітыя» рыфмы накшталт «сонца — аконца — бясконца», «каханне — чаканне», «любоў — зноў».

Акрамя таго, у некаторых вершах Анхелы Эспіносы Руіс зрэдку сустракаюцца праявы немілагучнасці, альбо, кажучы мовай сучаснага вершазнаўства, парушэння эўфаніі, што адмоўна адбіваецца на мастацкай вартасці асобных твораў. Гэтыя парушэнні мілагучнасці звычайна выяўляюцца ў непажаданым збегу некалькіх галосных (так званы «шатус») ці зычных гукаў, якія найчасцей нават вымавіць цяжка: «без паэзіі / і іншых недахопаў»; «не ўзяла б з сабой»; «мне не адчуць, чыя я, // А самазадаволены дзядуля»; «А затое я адна»; «шэрасць снегу»; «утульна мне і у абдымках» ды інш. Вышэйпрыведзеныя ды ім падобныя збегі гукаў лепей заўжды пазбягаць, бо яны псуюць уражанне ад вершаў і нібы адмаўляюць вядомае выказванне нашага першага метафізічнага паэта Уладзіміра Жылкі аб тым, што «песняры, мастакі і музыкі, / характва і сугучнасці слугі». А дзеля таго, каб падобных непажаданых рэчаў і іншых хібаў не сустракалася, адразу пасля напісання не варта вершы несці ў друк, а лепей спачатку даць ім час «адляжацца», а затым спакойна, непаспешліва іх перачытваць, выпраўляць-дапрацоўваць, альбо, як больш стагоддзя таму раіў беларускі класік, «трэба з сталі каваць, гартаваць гібкі верш, / Абрабіць яго трэба з цярпеннем» (Максім Багдановіч, верш «Песняру»).

Тым не менш, пры пэўных сваіх недахопах паэзія Анхелы Эспіносы Руіс у цэлым уяўляе сабой досыць арыгінальны і нехарактэрны для айчыннага прыгожага пісьменства мастацкі феномен, адметнымі рысамі якога з’яўляюцца вострая пачуццёвасць, экзальтаванасць і пэўная экзатычнасць рамантычнага ў сваёй аснове светаўспрымання, надзвычай актыўная (часам ледзь не ліхаманкавая) вобразатворчасць, узвышана-акрыленая натхнёнасць паэтычнага выказвання.

А напрыканцы хочацца пажадаць паэтцы далейшай творчай эвалюцыі, мастацкага (сама) ўдасканалення і паспяховага пакарэння новых паэтычных вяршынь. І верыцца, што яна зможа на іх узысці, бо для гэтага ў яе ёсць практычна ўсё неабходнае: прырод(жа)ны талент, творчая апантанасць, жыццёвая няўрымслівасць і магутны мастацкі імпэт.

А яшчэ варта шчыра падзякаваць аўтарцы за тое, што яна дае ўсім нам, жыхарам Беларусі, выдатны прыклад служэння беларускай мове і літаратуры, а маладым (і не вельмі) творцам дае заўважны штуршок да актыўнага творчага самавыяўлення на ніве роднай культуры.

...У свой час Райнер Марыя Рыльке вельмі хораша сказаў пра тое, што быць мастаком — гэта значыць «адмовіцца ад разліку і ліку, расці, нібы дрэва, якое не прыспешвае сваіх сокаў і сустракае вясновыя буры без хваляванняў, без страху, што за імі ўслед не наступіць лета». Дык няхай жа таленавітая іспанска-беларуская паэтэса Анхела Эспіноса Руіс у творчым сэнсе расце, як тое дрэва, вышэй і вышэй, пускаючы свае карані ўглыб беларускай зямлі, углыб беларускага паэтычнага Слова!

«Цяпер там мой смутак і боль»

Я не сустракаў такога беларускага паэта, у вершах якога так часта сустракалася б слова «хутар» і вытворныя ад яго, як у Івана Лагвіновіча (16 студзеня 1940 — 29 сакавіка 2011).

Мяне ўразіла тое, што паэт ва ўсіх сваіх аўтабіяграфічных тэкстах пазначаў месцам свайго нараджэння хутар Запрапасць Ганцавіцкага раёна, а не вёску Малкавічы , з якой паходзілі яго бацькі. Я сам нарадзіўся на хутары, але ў маіх метрыках і ў пашпарце месцам нараджэння пазначана суседняя з Малкавічамі вёска Задуб'е, і я «здаўся», пішу, што нарадзіўся ў Задуб'і. І так у іншых хутаранцаў…

Наважыўшыся напісаць больш поўную біяграфію паэта-земляка, я пачаў збіраць звесткі аб Запрапасці ў людзей, якія на тым хутары жылі. Балазе далёка ісці не давялося. У «маім» Задуб'і жыве Валянціна Валасюк (у дзявоцтве Клішэўская), стрыечная сястра Івана Лагвіновіча, а ў Малкавічах — Ганна Клішэўская, другая яго стрыечная сястра. Першая нарадзілася ў 1937 годзе, другая — у 1942-м. Хутар Запрапасць і яго ваколіцы яны ведалі як свае пяць пальцаў. А яшчэ ў Малкавічах жыве Фёдар Шапялевіч, сын паэтавай сястры Паўліны. Ён нарадзіўся ў Запрапасці ў 1957-м і мог расказаць пра жыццё хутара пасля таго, як улада пачала выштурхоўваць яго насельнікаў у Малкавічы.

Уже калі я зрабіў даволі за́пісаў пра хутар і яго ваколіцы, загадчыца Малкавіцкай бібліятэкі-музея Любоў Дзямчук паказала мне копію рукапісу Івана Лагвіновіча «Запрапасць». Аказваецца, на пачатку XXI стагоддзя загадчыца бібліятэкі-музея папрасіла Івана Лагвіновіча апісаць сваю малую радзіму. І калі паэт выканаў просьбу, арыгінал рукапісу (тры аркушы) быў перададзены ў Ганцавіцкую раённую бібліятэку.



Іван Лагвіновіч у войску

Прачытаўшы рукапіс «Запрапасць», я наважыўся падрыхтаваць яго да друку. Пагатоў усё напісанае Лагвіновічам я мог спраўдзіць са сваімі запісамі. Асобныя дэталі мог яшчэ раз удакладніць у родзічаў паэта.

Не названага па імені Клішэўскага, наймалодшага брата паэтавай маці, Тэклі Міхайлаўны, які жыў каля Белай Горкі, звалі Канстанцінам. Ягоныя дочкі Валянціна і Ганна, пры якіх я ўжо напісаў тут, былі маімі галоўнымі інфарматаркамі пра Запрапасць.

Іван Лагвіновіч піша, што з хутара перасялялі ў сяло ў 1960–1961 гадах. Аднак былі сем'і (як, напрыклад, тыя ж Клішэўскія), якія трымаліся і да 1970-х. Самым жа апошнім хутаранцам быў Іван Кошман, якога Іван Лагвіновіч не згадаў. Праўда, жыў той гаспадар за Белаю Горкаю.

Сына Данілы Дзмітровіча, які быў партызанам і якога забілі ў баявой сутычцы немцы, звалі Аляксандрам. У кнізе пра Ганцавіцкі раён з серыі «Памяць» можна прачытаць, што ён нарадзіўся ў 1919 годзе і загінуў у верасні 1943-га.

…На заканчэнне адзначу, што нядаўна тыя тры аркушы, спісаныя рукою Івана Лагвіновіча, з Ганцавіч былі перададзены ў Малкавічы, у бібліятэку-музей.

Анатоль Сідарэвіч

Запрапасць



Іван ЛАГВІНОВІЧ

Мая маленькая радзіма — хутар Запрапасць.

На яго можна было патрапіць з сяла Малькавічы, перайшоўшы чыгуначны пераезд у тым месцы, дзе цяпер прыпынны пункт «Маладзевы», і кіруючыся на захад па наезджанай дарозе. Адразу за сялом — вялікае поле Калюга з галінастым дубам пасярэдзіне, пры самай дарозе. Раней за полем, злева і справа, на рознай адлегласці адзін за адным віднеліся хутары.

За Калюгаю поле звужаецца, сціскаецца з двух бакоў балацявінамі, то тут, то там сярод палявой прасторы і цяпер ганарліва красуюцца бярозавыя гайкі розных памераў і формаў з абавязковымі лагчынкамі ўсярэдзіне. Тут хутары месціліся то ўдалечыні, то пры дарозе ад палавіны адлегласці, што ад Малькавіч да Запрапасці.

А далей грудок звужаецца яшчэ больш, аж пакуль не ўпіраецца ў імшарыну. Нашы продкі знайшлі на ёй найвузейшае месца і праклалі грэблю. Назвалі яе Малой. Бо Вялікая — за наступнай высечкай, якая доўгі час была полем. Спадабалася мясціна маладому тады гаспадару Паўлюку Каняцпольскаму (Рыжаму), і пабудаваўся тут, пры ўездзе на Вялікую грэблю. Толькі калодзежа не выкапаў, бо побач, за дзесяць крокаў ад хаты, пад густой разлапістай ялінаю, крыніца была. Чыстая ды сцюдзёная вада.

Для Вялікай грэблі шмат алешніку давялося ссекчы нашым дзядам ды бацькам, бо тут ужо не імшарына, а грузкая балацявіна была. Ладныя сенажаці ўтварыліся з абодвух бакоў на высечках. А над ручаём, што працякаў пасярэдзіне, масток спарудзілі з сасновых бярвенняў, каб веснавою паводкаю не размывала грэблю. Мабыць, гэтае месца й называлася Проспасцю, бо далей ужо была Запрапасць.



Запрапасць. Памятны знак на месцы бацькоўскай хаты

Пастараюся апісаць хутар на той час, калі я нарадзіўся: напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны. Ён месціўся паміж Вялікаю грэбляю і Белаю Горкаю, на выцягнутай з усходу на захад кіламетровай выспе.

Адразу за грэбляю жылі Васілевічы (Баранчуковы). Хата іхняя стаяла па правую руку ад дарогі, а гаспадарчыя пабудовы — па левую. Ва ўсіх жыхароў хутара будынкі месціліся справа, а злева — былі агароды.

Сядзібы Масалевічаў (Сазонавых) і Шапялевічаў (Іванчыкавых) стаялі на пэўнай адлегласці ад дарогі, бо тут, паўз дарогу метраў гэтак з дзвесце цягнуўся лужок. Для праезду да сваіх двароў ім давялося капаць і ўзводзіць сыпанкі па ўсёй шырыні лужка. З цягам часу яны парaслі па краях асінікам ды бярэзнікам і ўтварылі прыгожыя дамбачкі з ціністымі алеямі.

За лужком была наша сядзіба. Хоць мой бацька быў непісьменны, аднак у душы быў, мяркую, большы паэт, чым я. Ён выбраў на гэтай выспе самае маляўнічае месца. За хатаю шумелі чатыры магутныя вячыстыя дубы. Пяты — з усходняга боку, пад вакном — прыгожа ўпісаўся ў сасновы барок, што быў падобны на невялічкі парк, бо быў заўсёды дагледжаны, чысты. На дубах і соснах летнім днём весела гулі, то вылятаючы, то залятаючы ў вуллі-борці, працавітыя пчолы. Паміж барком і дарогай, у лагчынцы, люстравалася сажалка-копанка. З яе палівалі гародніну, палілі жывёлу.

З хутара перасялялі ў сяло ў 1960–1961 гадах. Цяпер там мой смутак і боль. Гайкі спілавалі, палі зарастаюць. Усё зынaчылася. Цяжка стрымаць слёзы

За нашаю была сядзіба Адама Дзічко (Ярмолава). Ён таксама быў дасціпным, дбайным гаспадаром. Заклаў ладны сад, па перыметру абсадзіў ляшчынавымі кустамі; пад імі стаялі сапраўдныя вуллі з пчоламі. Ягоная пісьменнасць дазваляла гаспадарыць паводле тагачаснай навукі.

Але вернемся на хутар. Перайшоўшы Белую Горку, праз дзвесце метраў мы траплялі на сядзібу Навумікаў (Джолiных). Ім таксама давялося перажыць пажар… Але адбудаваліся і працягвалі жыць на ранейшым месцы. На поўнач ад іх, па-суседску з дубровaю, жылі Хілютычы. Гаспадара называлі Барыс Галузіны, а гаспадыню — Настуся Дзічка. Недзе ў сярэдзіне пяцідзясятых перабраліся на сядзібу Шэметы (Кісялёвы) жылі за Барылавым гайком. З імі суседнічалі Сенюковічы (Базылёвы). Дзед Язэп [Сенюковіч] быў знаным майстрам-сталяром. Рабіў скрыпкі, якія гучалі лепей за фабрычныя. І сам някепска іграў.

Каля Белай Горкі жылі Клішэўскія — наймалодшы брат маёй маці з сям'ёю. Не было ў іх мянушкі.

Напярэдадні адступлення нямецкіх войскаў на наш хутар увечары заявіўся карны атрад. Мы, жыхары хутара, хаваліся тады ў сваякоў у сяле. Сядзібы Васілевічаў і Шапялевічаў спалілі дашчэнту. У нас і ў Адама Дзічко згарэлі гаспадарчыя пабудовы, хаты засталіся. Астатніх не кранулі. А карaлі акупанты за сувязі з партызанамі. Шапялевічы адбудаваліся на папялішчы, а Васілевічы перабраліся на станцыю Малькавічы.

З хутара перасялялі ў сяло ў 1960–61 гадах.

Цяпер там мой смутак і боль. Гайкі спілавалі, палі зарастаюць. Усё зынaчылася. Цяжка стрымаць слёзы.

Ланцуг Белай Горкі, вышынёю метры з два, то павышаючыся — то паніжаючыся, а ў іншых месцах і зусім знікаючы, цягнецца па Грушэцкім, Захлынні ды Каранай аж да станцыі Малькавічы. Пясчаная града, што паралеліць уздоўж Задубенскай вуліцы [у Малькавічах], — звяно таго ланцуга.

Але вернемся на хутар. Перайшоўшы ... сваяка паміж Запрапасцю і Малькавічамі.

На поўдзень ад Запрапасці, вярсты праз дзве, на паніжанай у тым месцы Белай Горцы жылі яшчэ адны Хілютычы, але з іншымі мянушкамі: Васіль Паляк і Мар'я Кісяліха.

Іхнім суседам быў Сцяпан — Сцепанец Шапялевіч (Карнеевы). Пасля вайны не жылі там, перабраліся ў сяло. З той мясціны перасяліўся бліжэй да сяла і Іван Сенюковіч (Боб), сын Язэпа Базылёва. Засталася ў гэтым кутку пры балоцістым лузе Залоззе сям'я Казюковых, тожбо Шапялевічаў. А калі ісці напрасткі ад Казюковых да Джолiных, можна было ўбачыць на доўгім полі паміж імшарынамі, багатымі на журавіны і гадзюк, непаглядную хату і невялікі хлеўчык Язэпа Лагвіновіча (Кашавара). Крушніком называлася тое ўрочышча. На паўночны ўсход ад таго поля хутараваў Даніла Дзмітровіч (Гранюк). Ягоны сын быў партызанам і загінуў у адным з баёў. Немцы спалілі [сядзібу Дзмітровіча] дашчэнту. Пабудаваўся ў сяле. А тое поле, дзе ён жыў, сталі называць Дворышчам.

На станцыю з Запрапасці мы хадзілі напрасткі праз Яловую Шышку і Ліпінне. У Яловай Шышцы недзе да пяцідзясятага года жылі Паўлоўскія, а на Ліпінні Клішэўскія. Паміж імі — Сяргей Каняцпольскі з сям'ёю. На калёсах можна было ехаць на станцыю гэтым шляхам толькі ўлетку, калі высыхала вада ў двух брадах цераз стругі (забалочаныя нізіны), ды калі замярзала.

Цяпер ад станцыі ёсць дарогі толькі да таго месца, дзе жыў Сяргей Каняцпольскі. А Яловая Шышка зарасла цёмным непралазным ельнікам ды зялёным мохам. Блукаючы там у 1985 годзе, склаліся такія радкі: «На дарозе, што вяла на хутар, цяпер буяе дзікая трава. І ў ёй гніе вяровачнае пута…». Зрэдчас я прыязджаю назбіраць на Ліпінні кошык зялёнак і падзялёнак.

Красавік 2003

Падрыхтаваў да друку Анатоль Сідарэвіч

Фота з архіва сям'і І. Лагвіновіча і аўтара

Год Пастэрнака

Паводле звестак прэс-службы Дзяржаўнага музея гісторыі расійскай літаратуры імя У. І. Даля, сёлета Дом-музей Барыса Пастэрнака ў пісьменніцкім пасёлку Перадзелкіна будзе адзначаць дзве важныя даты: 130-гадовы юбілей з дня нараджэння пісьменніка і 30-годдзе самога музея.

Цэнтральнай падзеяй юбілейнага года стане праект «Барыс Пастэрнак. Тапаграфія лёсу» — цыкл з пяці выстаў, кожная з якіх прысвечана «рыфмам лёсу» Барыса Пастэрнака: тым мясцінам, якія былі для Пастэрнака значныя (Масква і Перадзелкіна), і тым, у якія не раз і невыпадкова прыводзілі яго акалічнасці жыцця: Нямеччына, Урал (Расія), Грузія. На працягу года да музейных экспазіцый будуць дадавацца і экскурсіі, лекцыі, выступленні даследчыкаў творчасці пісьменніка.

Першая выстава цыклу — «Тапаграфія лёсу. Пралог. Масква» — адкрылася ў Доме-музеі 18 студзеня і будзе даступная для наведвальнікаў да 1 сакавіка.

На шляху да мары,
або Дзе працавалі вядомыя пісьменнікі ХХ стагоддзя

Многія літаратары ХХ стагоддзя пачыналі сваю працоўную дзейнасць зусім не з напісання раманаў і вершаў. Каб матэрыяльна забяспечыць сваё жыццё, ім даводзілася асвойваць самыя розныя прафесіі.

Так, Яўгеній Замяцін, стваральнік антыўтопіі «Мы», якая аказала значны ўплыў на сусветнавядомых пісьменнікаў Джорджа Оруэла і Олдаса Хакслі, атрымаў тэхнічную адукацыю, скончыў караблебудаўнічы факультэт політэхнічнага інстытута ў Санкт-Пецярбургу, а пасля яшчэ два гады выкладаў у той жа ВНУ. Пазней служыў на верфях у Англіі, займаючыся будаўніцтвам расійскіх ледаколаў, быў адным з асноўных праекціроўшчыкаў ледакола «Святы Аляксандр Неўскі», які атрымаў пасля кастрычніцкай рэвалюцыі назву «Ленін». Пасля вяртання ў Расію ў 1917 годзе Яўгеній Замяцін цалкам прысвяціў сябе літаратурнай творчасці. Праўда, яго знакавы раман «Мы» ўпершыню выйшаў у свет у Нью-Ёрку ў 1925 годзе, а на радзіме быў апублікаваны толькі ў 1988-м. У 1931 годзе пісьменнік эміграваў, а з 1932-га пастаянна пражываў у Парыжы.

Аўтар «Лаліты» ды іншых вядомых твораў Уладзімір Набокаў яшчэ ў школьныя гады захапіўся энтамалогіяй. Пісьменнік вельмі любіў матылькоў, ім прысвячаў свае навуковыя працы і нават адкрываў новыя віды насякомых. Уладзімір Набокаў, пачынаючы з 1920 года, апублікаваў 25 артыкулаў па энтамалогіі, прапанаваў новую класіфікацыю аднаго з відаў матылькоў, курыраваў калекцыю матылькоў у музеі пры Гарвардскім універсітэце. І нават у творах пісьменніка ста́ла прысутнічалі згадкі гэтых насякомых. Яны дапамагалі Уладзіміру Набокаву ўзмацняць асобныя сцэны і характарызаваць вобразы герояў.

Міхаіл Шолахаў, аўтар «Ціхага Дона», спрабаваў сябе ў творчасці яшчэ са школьных гадоў. А працоўную дзейнасць пачаў ужо ў 15-гадовым узросце ў якасці «ліквідатара непісьменнасці». Пазней служыў справаводам у рэўкаме, затым скончыў падатковыя курсы і быў харчовым інспектарам, затым — памочнікам бухгалтара, падатковым інспектарам, рабочым домакіраўніцтва. Яго першы фельетон «Выпрабаванне» быў надрукаваны ў «Юношеской правде», пасля чаго Міхаіл Шолахаў стаў актыўна публікавацца, і літаратурная творчасць неўзабаве стала яго асноўнай прафесіяй.

Свой першы ганарар малы Стывен Кінг атрымаў ад мамы, якая заахвочвала літаратурную творчасць сына і заплаціла яму па 25 цэнтаў за 4 апаведы пра труса. Пазней будучы «кароль жахаў» разам з братам заняўся выдавецкай дзейнасцю. Дэвід і Стывен самі пісалі матэрыялы і раздрукоўвалі сваю газету «Лісток Дэйва» на мімеографе, затым распаўсюджвалі яе сярод суседзяў па цане 5 цэнтаў за асобнік. Падчас навучання ў каледжы пісьменнік працаваў на ткацкай фабрыцы ўпакоўшчыкам, пазней падзарабляў у пральні. Пасля заканчэння Універсітэта штата Мэн і педагагічных курсаў у каледжы працаваў настаўнікам англійскай мовы.

Харука Муракамі перад тым, як напісаў сваю першую кнігу і стаў аўтарам мноства бэстселераў, быў уладальнікам джаз-бара «Піцер Кэт» у Токіо. А пасля таго, як заняўся літаратурнай творчасцю, ён вёў ток-шоў на такійскім тэлебачанні пра заходнюю музыку і субкультуру. Таму чырвонай лініяй праз усё жыццё японскага пісьменніка праходзіць тэма музыкі, якая, па яго ўласным прызнанні, служыць для яго адвечнай крыніцай натхнення.

У падрыхтоўцы старонкі выкарыстаны матэрыялы парталаў «ТАСС», swissinfo.ch, CNN і novostiliteratury.ru.

ПРЭМІІ

Швейцарская літпрэмія

Пісьменніца Сібіл Берг атрымала галоўны літаратурны прыз Швейцарыі (Swiss Grand Prix Literature).



Спадарыня Берг, якая нарадзілася ў Нямеччыне і цяпер жыве ў Цюрыху (Швейцарыя), была ўзнагароджана прэміяй «за працу ўсяго жыцця». У апублікаванай заяве Федэральнага ўпраўлення культуры Швейцарыі адзначаецца: «Федэральнае літаратурнае журы вылучыла Сібіл Берг за наватарскі, адданы і важны голас сучаснай нямецкамоўнай літаратуры».


Сібіл Берг напісала 15 раманаў. Яна таксама з'яўляецца аўтарам шматлікіх тэатральных п'ес і радыёпастановак. Нарадзілася пісьменніца ў 1962 годзе ва Усходняй Германіі. Яна атрымала «Швейцарскую літаратурную прэмію 2019 года» за свой «змрочны футурыстычны раман» «GRM. Brainfuck».

Сібіл Берг была ўганаравана і аўстрыйскай літаратурнай узнагародай «Nestroy Prize-2019» за лепшую нямецкамоўную п'есу.

Яе першы раман быў апублікаваны ў 1997 годзе (праз год пасля яе пераезду ў Цюрых).

Журы «Швейцарскай літаратурнай прэміі» таксама прысудзіла двухгадовую спецыяльную ўзнагароду за пераклад Марыён Граф, якая пераклала мноства пісьменнікаў і паэтаў, у тым ліку Маркуса Вернера, Клаўса Мерца, Эрыку Буркарт, Эрыку Педрэцці, Юрга Шубігера, Конрада Фердынанда Мэйера, Франца Хохлера, Ганну Ахматаву, Уладзіміра Адоеўскага.

Грашовы памер прэміі — 40 тысяч швейцарскіх франкаў (каля 40 тысяч еўра) кожная. Узнагароды былі ўручаны пераможцам 13 лютага ў сталіцы Швейцарыі Берне.



Прэміі імя Шолахава

Да 115-годдзя з дня нараджэння вядомага пісьменніка Міхаіла Шолахава рэгіянальныя ўлады Расіі заснавалі літаратурную прэмію яго імя.

Інфармацыя распаўсюджана са спасылкай на першага намесніка губернатара Растоўскай вобласці Ігара Гуськова.

Першы конкурсны адбор адбудзецца з сакавіка па красавік гэтага года, а ўжо ў траўні — у дзень нараджэння пісьменніка — на літаратурна-фальклорным фестывалі «Шолахаўская вясна» ў станіцы Вешанская Растоўскай вобласці Расіі пройдзе ўрачыстае ўганараванне лаўрэатаў прэміі.

Літаратурную ўзнагароду будуць уручаць з інтэрвалам раз у 5 гадоў у 3-х намінацыях: «Сучасная проза», «Сучасная паэзія» і «Літаратурная крытыка». Грашовы складнік прэміі — 20 тысяч расійскіх рублёў.

Нагадаем, што да нядаўняга часу існавала і яшчэ адна прэмія ў гонар расійскага пісьменніка, аўтара «Ціхага Дона», — Міжнародная прэмія імя Міхаіла Шолахава ў галіне літаратуры і мастацтва. Яна была заснаваная ў 1992 годзе Міжнароднай супольнасцю пісьменніцкіх саюзаў (правапераемцам Саюза пісьменнікаў СССР), Саюзам мастакоў Расіі, выдавецтвам «Советский писатель» і Маскоўскім дзяржаўным адкрытым педагагічным універсітэтам імя. М. А. Шолахава.

Прэмія прысуджалася расійскім і замежным празаікам, паэтам, дзяржаўным і грамадскім дзеячам «за лепшыя творы на гістарычныя тэмы, за паэтычныя зборнікі і філалагічныя даследаванні, выдадзеныя ў Расіі». Лаўрэат атрымліваў дыплом, памятны медаль і грашовую ўзнагароду. Уручалася прэмія ў Маскве ў апошнія дні траўня (да дня нараджэння Міхаіла Шолахава).

Старшыняваў у журы пісьменнік Юрый Бондараў. Лаўрэатамі прэміі былі неардынарныя асобы і — не заўсёды пісьменнікі: Радаван Караджыч (Сербія, 1993), Арсеній Ларыёнаў (празаік, кіраўнік расійскага выдавецтва «Советский писатель», 1994), Фідэль Кастра (Куба, 1995), Юрый Бондараў (старшыня журы прэміі, Расія, 1995), Генадзь Зюганаў (Расія, 1996), Аляксандр Лукашэнка (Беларусь, 1997); Аляксандр Праханаў, Расул Гамзатаў (Расія, 1998), Патрыярх Алексій ІІ (2000), Слабадан Мілошавіч (Сербія, 2002), Міхаіл Савіцкі (Беларусь, 2002), Уга Чавес (Венесуэла, 2007) ды іншыя.

Апошняе ўганараванне Міжнароднай прэміяй імя Міхаіла Шолахава, паводле інфармацыі ў СМІ, адбылося ў 2010 годзе.

Прэмія «Чыстая кніга»

Экспертная рада Усерасійскай літаратурнай прэміі імя Фёдара Абрамава «Чыстая кніга», якую ўзначальвае пісьменнік Сяргей Шаргуноў, вызначыла пераможцаў 2019 года.



У намінацыі «Сучасная проза» лаўрэатамі прэміі «Чыстая кніга» сталі адразу два аўтары: Уладзімір Лічуцін (за раман «У чаканні Бога») і Дзмітрый Новікаў (за раман «Галамянае полымя»).

Лаўрэатам прэміі ў намінацыі «Літаратурная крытыка» назвалі Андрэя Рудалева (за кнігу «Чатыры выстралы: пісьменнікі новага тысячагоддзя»).

Спецыяльнай прэміяй «За ўклад у развіццё паўночнай літаратуры» адзначаны Уладзіслаў Папоў, а спецпрэмію «За ўклад у вывучэнне і прапаганду творчасці Фёдара Абрамава» атрымала літаратуразнаўца Алена Галімава.

Памер кожнай узнагароды складае 500 000 расійскіх рублёў (каля 17 000 беларускіх рублёў).

Цырымонія ўзнагароджання адбылася ў Архангельску 27 лютага 2020 года на ўрачыстай вечарыне, прысвечанай 100-гадоваму юбілею Фёдара Абрамава.

Савецкі пісьменнік, літаратуразнаўца і публіцыст Фёдар Абрамаў (1920–1983) з'яўляецца адным з самых вядомых прадстаўнікоў «вясковай прозы» — кірунку савецкай літаратуры 1950–1980-х гадоў. У яго творах асэнсоўваецца драматычны лёс сялянства і рускай вёскі ў ХХ стагоддзі, а творы вызначаюцца абвостранай увагай да пытанняў маральнасці, да ўзаемаадносін чалавека і прыроды.

Прадстаўнікамі «вясковай прозы» называюць Васіля Бялова, Валянціна Распуціна, Васіля Шукшына, Віля Ліпатава, Барыса Мажаева, Віктара Астаф'ева.

Літаратурная Беларусь
Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА.
Тэлефон для даведак: (8-017) 354-80-91. Адрас электроннай пошты: sbp@tut.by